ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 20 (5394)
НЯДЗЕЛЯ
26
СТУДЗЕНЯ
1935 г.
Год выдання XIX

...мы маем усе ўмовы, неабходныя для таго, каб дабіцца ў бліжэйшым будучым штогадовай вытворчасці зярна ў размеры 7—8 мільярдаў пудоў

І. СТАЛІН.

(З прамовы на нарадзе перадавых камбайнераў і камбайнерак 1 снежня 1935 г.)

Прыём дэлегацыі совецкага Азербайджана кіраўнікамі партыі і урада у Крэмлі

21 студзеня, у Крэмлі, у сувязі з пятнаццацігодзем устанаўлення Совецкай улады ў Азербайджане, адбыўся прыём Азербайджанскай дэлегацыі кіраўнікамі партыі і ўрада. У складзе дэлегацыі — лепшыя стаханаўцы нафтавай прамысловасці, лепшыя хлапкаробы рэспублікі, інжынеры, аграномы, артысты, паэты, урачы, настаўнікі. Дэлегацыю ўзначальваюць сакратар ЦК АКП(б) т. **Багіраў** і старшыня Соўнаркома Азербайджанскай ССР т. **Рахманаў**.

З'яўленне ў зале таварышоў **Сталіна, Молатава, Калініна, Варашылава, Орджанікідзе, Мікаяна, Чубара, Андрэева, Ежова, Якаўлева** было спаткана бурнымі працяжнымі апладысментамі і крыкамі «ўра». Раздаюцца прывітальныя воклічы на азербайджанскай і рускай мовах: «Да здравствует товарищ Сталин!», «Яшасун догма Сталинимиз».

Таварыш **Молатаў** ад імя Урада і Цэнтральнага Камітэта партыі віншаваў працоўных Азербайджана з 15-годдзем устанаўлення Совецкай улады ў Азербайджане.

Прывітальныя словы таварыша **Молатава** былі спаткаены авацыяй па адрасу таварышоў Сталіна, Молатава, Варашылава, Орджанікідзе і іншых кіраўнікоў партыі і ўрада.

З прамовамі выступілі таварышы Ісмаіл Мікаіл Задэ—брыгадны майстар промысла імя Леніна, Аліева Алмас Джамал Кызы — звеннявая калгаса імя Сталіна Кіравa-бадскага раёна, Нурыева Сона Піры Кызы — лётчыца, Гамзін Егор Абрамавіч — гоншчык нафтаперагоннага завода імя Сталіна, Аліеў Мамед Рза — брыгадзір высокаўраджайнага па бавоўне калгаса «Юлдуз», Крэмлева Яўгенія Александраўна — піонер упядрэння егіпецкай бавоўны, Таірава Таіра Акпер Кызы — інжынер-нафтавік, Далін Марк Александравіч — інжынер па сінтэтычнаму каўчуку, Асланаў Вагім Гусейн Бала оглы — камандзір танка, Векілаў Самед Бургун — паэт.

Усе выступаўшыя таварышы расказвалі кіраўнікам партыі і ўрада аб поспехах Азербайджана, аб развіцці вытворчасці нафты, бавоўны, аб вясёлым і заможным жыцці працоўных Азербайджана, аб сваіх стаханаўскіх метадах работы, аб гіганцкім росце культуры і тюркскіх кадраў у Азербайджане.

У канцы нарады выступілі спатканыя бурнымі авацыямі таварышы **Орджанікідзе** і **Молатаў**.

Першыя прывітальныя словы тав. Молатаў вымаўляе на азербайджанскай мове.

У заключэнне тав. Молатаў паведаміў, што па ініцыятыве таварыша **Сталіна** Прэзідыум нарады ўносіць у вышэйшыя органы прапанову аб узнагароджанні лепшых таварышоў з Азербайджана вышэйшай узнагародай Совецкага Саюза — ордэнамі. Ён таксама паведаміў аб рашэнні Урада ўзнагародзіць прадстаўленыя на нарадзе калгасы грузавымі аўтамашынамі.

Палкая, доўга не змаўкаючая авацыя ў гонар таварышоў **Сталіна, Молатава, Варашылава, Орджанікідзе** была адказам на гэтыя словы.

Кожнаму ўдзельніку нарады таварыш Молатаў уручае падарункі Урада: па патэфону з пласцінкамі і гадзіннікі — мужчынам — кішэневыя, жанчынам — ручныя.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС

9 студзеня намеснік народнага камісара па замежных справах **Б. С. Стаманякоў** запрасіў да сябе японскага пасла п. Ота і заявіў пратэст з прычыны меўшай месца ў той-жа дзень пасадкі японскага ваеннага самалёта на совецкай тэрыторыі і з прычыны агрэсіўных паводзін лётчыкаў, якія выявіліся ў нападзе на мірнага селяніна, і ў страляніні ў прадстаўнікоў совецкай пагранічнай аховы.

Японскі пасол заявіў, што ён перадасць гэта паведамленне свайму ўраду і адначасова прасіў аб выдачы самалёта і лётчыкаў.

13 студзеня японскі міністр замежных спраў п. Хірота запрасіў да сябе паўпрэда СССР т. Юрэнева, выказаў жаль з прычыны спуску японскага самалёта на совецкую тэрыторыю і прасіў аб выдачы самалёта і лётчыкаў японскім уладам, спасылаючыся на непраднамераны характар іх пералёту.

14 студзеня з аналагічнай просьбай пасол Ота зноў звярнуўся да тав. Стаманякова.

23 студзеня тав. Стаманякоў прыняў японскага пасла п. Ота і заявіў яму, што толькі што завершанае следства пацвердзіла поўнасцю паведамленне, зробленае паслу 9 студзеня аб віноўнасці лётчыкаў. Тым не менш, прымаючы пад увагу жаль, выказаны японскім міністрам замежных спраў і просьбы апошняга і самога пасла, а таксама ўлічваючы тыя акалічнасці, што ў рэзультаце сваіх агрэсіўных дзеянняў японскія лётчыкі сур'ёзна пацярпелі, атрымаўшы раненні, совецкія ўлады, ідучы насустрач просьбе японскага ўрада, згадзіліся выдаць неадкладна лётчыкаў і самалёт.

Пасол п. Ота выказаў падзяку за хуткае і спрыяючае вырашэнне пытання аб звароце лётчыкаў і самалёта.

НОВЫ ПРАВАКАЦЫІНЫ НАПАД ЯПОНА-МАНЧЖУР НА МНР

УЛАН-БАТОР, 23 студзеня. (ТАСС). Тут толькі што атрыманы весткі аб новым правакацыйным нападзе японска-манчжур на мангольскую тэрыторыю.

22 студзеня японска-манчжурскі атрад на трох грузавіках, маючы ў рэзерве яшчэ 5 машын, пад'ехаў да мангольскай заставы Чынгіз-Хан на тэрыторыі МНР, што ля возера Ханур, за 25 кілометраў ад граніцы, і з адлегласці ў 1½ кілометра адкрыў, страляніну з лёгкага кулямёта, пад прыкрыццём якой пачаў набліжацца да заставы. У рэзультаце аказанага мангольскай пагранічнай аховай энергічнага адпору, японска-манчжурскі атрад адышоў у напрамку граніцы, пакінуўшы на месцы сутычкі аднаго забітага і адзін лёгкі кулямёт.

Ідучы назад, японска-манчжурскі атрад захапіў двух мангольскіх дазорных цырыкаў (байцоў мангольскай народнай арміі), лёс якіх невядомы.

Дэлегацыя Чэрнігаўскай вобласці ў Менску

Для ўдзелу ва ўсебеларускай нарадзе па ўраджайнасці ў Менск прыехала дэлегацыя з Чэрнігаўскай вобласці. У гутарцы з нашым карэспандэнтам кіраўнік дэлегацыі, намеснік старшыні Чэрнігаўскага абласнога выканкома советаў, тав. **Ідзін**, заявіў наступнае:

Асноўная мэта нашай дэлегацыі — устанавіць цесную сувязь з кіраўнікамі БССР, калгаснікамі вашай рэспублікі, абмяняцца вопытам работы і запрасіць вашу дэлегацыю ў Чэрнігаў.

Склад нашай дэлегацыі — 18 чалавек. З намі прыехалі ўзнагароджаная ордэнам Леніна тав. Касцючэнка Марыя — трактарыстка Сямёнаўскай МТС, якая за сваю змену ўзарала на «ХТЗ» 757 гектараў, а ўсяго на трактар — 1.300 гектараў; узнагароджаны ордэнам Леніна брыгадзір паляводчай брыгады калгаса «Рэвалюцыйны шлях» тав. Ісачанка. Яны атрымалі ў калгасе ўраджай аўса 200 пудоў з гектара, ільносемя 9,5 цэнтнера; ордэнаносец тав. Друзь — брыгадзір паляводчай брыгады калгаса імя Постышэва, Камараўскага раёна, які атрымаў па сваёй брыгадзе ўраджай зернавых 210 пудоў, бульбы 1.900 пудоў з гектара.

24 студзеня дэлегаты Чэрнігаўскай вобласці прымалі ўдзел у раённым злёце стаханаўцаў сельскай гаспадаркі ў Гомелі. Калгаснікі Гомельшчыны рашылі выклікаць на соцыялістычнае спаборніцтва Дабрынскі раён, Чэрнігаўскай вобласці.

1 лютага г. г., у 6 гадзін вечара, у зале пасяджэнняў Прэзідыума ЦВК БССР склікаецца ПЛЕНУМ БЮДЖЭТНАЙ КАМІСІІ ЦВК БССР.

Старшыня Бюджэтнай камісіі ЦВК БССР КАВАЛЬЧУК.

Адкрылася ўсебеларуская нарада па ўраджайнасці

Учора ў 7 гадзін 30 мінут вечара ў зале з'ездаў Дома ўрада адкрылася ўсебеларуская нарада перадавікоў ураджайнасці, трактарыстаў і машыністаў малатарань з кіраўнікамі КП(б)Б і ўрада БССР.

У сталіцу ордэнаноснай БССР з'ехаліся лепшыя майстры ўраджаю, людзі вялікага вопыту і практыкі, каб разам з кіраўнікамі партыі і ўрада вызначыць шляхі барацьбы за сталінскія 7—8 мільярдаў пудоў хлеба.

На нараду прыбыло 811 дэлегатаў з розных канцоў Совецкай Беларусі. У зале з'ездаў яны размясціліся акругамі і раёнамі. У першых радах дэлегацыі перадавых раёнаў — Меншчыны, Аршаншчыны, Случчыны. Сярод іх выдзяляюцца лепшыя прадстаўнікі беларускага народу, на чыіх грудзях красуюцца ордэны Працоўнага чырвонага сцяга і «Знак почета» — найвялікшая ўзнагарода за высокі ўраджай. Тут-жа госці брацкіх абласцей — Чэрнігаўскай і Заходняй, з якімі спаборнічаюць калгаснікі БССР.

Зала напаўняецца гукамі вясёлых песень. Гэта песні працы, што льюцца на калгасных загонах, песні дружбы народаў, што абагараваюць сэрцы мільёнаў працоўных, песні шчаслівага і радаснага жыцця, якое дала ім партыя і вялікі правадыр і настаўнік таварыш **Сталін**.

За сталом прэзідыума з'яўляюцца тт. **Гікало, Галадзед, Валковіч, Чарэякоў, Бенек, Картукоў** і іншыя члены ЦК КП(б)Б і ўрада. Уся зала ўстае, горача вітае кіраўнікоў партыі і ўрада БССР. Зала грыміць авацыяй у гонар таго, чыё імя натхняе мільёны да гераічнай барацьбы за светлую будучыню.

— Першаму барацьбіту за высокі ўраджай—таварышу **Сталіну** — «ура»!

— Няхай жыве вартавы совецкіх граніц рабоча-сялянская Чырвоная армія і яе жалезны нарком тав. **Варашылаў**.

Доўга не змаўкаюць апладысменты.

Нарком земляробства тав. **Бенек** адкрывае нараду. І калі ён гаворыць, што мы сабраліся сюды, каб намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па ажыццяўленню ўказанняў правадыра нашай партыі, правадыра народаў Совецкага Саюза таварыша **Сталіна** — даць на працягу бліжэйшых трох-чатырох гадоў 7—8 мільярдаў пудоў хлеба, вялікая зала з'ездаў зноў напаўняецца незмаўкаючымі апладысментамі.

— Нам дана канкрэтная задача па павелічэнню вытворчасці ільну і бульбы, па паляпшэнню нашай жывёлагадоўлі, — прадаўжае тав. Бенек. — Усе гэтыя задачы мы выканаем, калі маналізуем на гэту справу ўсіх калгаснікаў і калгасніц.

Тав. Бенек гаворыць аб вялікім стаханаўскім руху, які ахапіў мільёны рабочых і калгаснікаў нашай неасяжнай краіны — ад Менска да Владзівастока, ад Баку да Архангельска.

Гарняк **Алексей Стаханаў**, які некалькі месяцаў назад быў вядомы толькі сваім таварышам па шахце, сёння вядомы ўсяму Совецкаму Саюзу, усяму свету. Учора яшчэ невядомая **Марыя Дземчэнка**—маладая калгасніца Украіны — сёння таксама вядома ўсяму свету.

Вось як партыя і совецкі ўрад высока падымаюць людзей, якія добрасумленнай працай паказалі, як трэба працаваць у сваёй сацыялістычнай радзіме.

Пад крыкі «ўра» тав. Бенек называе імя лепшай трапальшчыцы БССР — комсамолкі **Антаніны Кірмашук**, якая ў сваім калгасе «Звязда», Заслаўскага раёна, устанавіла сусветны рэкорд ручной апрацоўкі ільну, натрапаўшы за дзень 150 кілограмаў ільновалакна.

Беларуская совецкая рэспубліка ў ліку іншых нячорназёмных абласцей атрымала канкрэтную задачу — на працягу трох-чатырох гадоў дабіцца не менш 90—100 пудоў зернавых, 4—5 цэнтнераў ільну і 900—1.100 пудоў бульбы з гектара. Гэта задача, — гаворыць т. Бенек,—у поўнай меры ажыццявіма, бо мы зараз маем ужо сотні калгасаў, сотні брыгад і звенняў, якія даюць значна больш таго, што мы павінны атрымаць праз 3—4 гады.

На нарадзе прысутнічаюць звыш 53 дэлегатаў, якія дабіліся зернавых па 100—120 пудоў з гектара, 36 дэлегатаў далі 120—140 пудоў з гектара, 14 дэлегатаў па 140—170 пудоў, і 4 дэлегаты па 170—200 пудоў. Дзесяткі дэлегатаў дабіліся ад 4 да 5,5 цэнтнераў ільновалакна з гектара.

1936 год у сельскай гаспадарцы, — гаворыць тав. Бенек,—павінен стаць суцэльным стаханаўскім годам.

На трыбуну падымаецца ордэнаносец тав. **Бляхерава**. Ад імя дэлегацыі Менскага раёна яна ўносіць прапанову выбраць таварыша **Сталіна** ганаровым старшынёй нарады. Бурнымі апладысментамі, якія пераходзяць у авацыю, дэлегаты адказваюць на прапанову.

У ганаровы прэзідыум нарады аднадушна пад апладысменты ўсёй залы выбіраецца палітбюро ЦК ВКП(б). Апладысменты яшчэ больш узмацняюцца, калі ордэнаносец тав. **Гарбуз** уносіць прапанову паслаць прывітальнае пісьмо таварышу **Сталіну** за подпісамі кожнага ўдзельніка нарады.

У прэзідыум нарады запрашаюцца прадстаўнікі чэрнігаўскай дэлегацыі — тт. **Філін** і **Ідзін**, і ад Заходняй вобласці — т. **Мікулін**.

Па прапанове тав. **Чарэякова** ў прэзідыум запрашаюцца знатныя людзі — ордэнаносцы БССР, Заходняй і Чарнігаўскай абласцей.

Першым атрымлівае слова старшыня калгаса **«Чырвоны партызан»**, Менскага раёна, т. **Бейне**, удзельнік усесаюзнай нарады перадавікоў ураджайнасці, узнагароджаны ордэнам Працоўнага чырвонага сцяга. З'яўленне на трыбуне т. Бейне дэлегаты сустракаюць дружнымі апладысментамі.

Ён гаворыць аб сваіх поспехах барацьбы за ўраджай, за якія атрымаў вышэйшую ўзнагароду.

На трыбуне тав. **Багуза**—старшыня калгаса **«Чырвоны бераг»**, Аршанскага раёна.

Ад працоўных Аршаншчыны тав. Багуза перадае прывітанне ЦК КП(б)Б і яго кіраўніку—лепшаму сталінцу тав. **Гікало**.

Тав. Багуза ад імя аршанскай дэлегацыі выклікае на соцыялістычнае спаборніцтва калгаснікаў Магілеўшчыны.

З вялікай увагай дэлегаты слухаюць прамову брыгадзіра **Чэрнігаўскай** вобласці, ордэнаносца т. **Друсь**. Ён гаворыць на роднай украінскай мове. Але яго словы зразумелы дэлегатам, словы большэвіцкіх спраў і барацьбы за сталінскі ўраджай.

Тав. Друсь перадае вопыт сваёй брыгады. Сёлета яго брыгада атрымала 210 пудоў зернавых і 2.000 пудоў бульбы з гектара, за што партыя і ўрад узнагародзілі яго ордэнам Леніна.

— Трэба прыкласці моцныя калгасныя рукі, і мы атрымаем з сваіх палёў яшчэ большы ўраджай, — заканчвае сваю прамову т. Друсь.

У канцы вячэрняга пасяджэння выступілі брыгадзір калгаса **«Звязда»**, Заслаўскага раёна тав. **Парцянкоў** і брыгадзір трактарнай брыгады Капыльскай МТС, ініцыятар усебеларускага спаборніцтва трактарных брыгад, член ЦВК БССР т. **Рачок Зоя**.

***

Нарада атрымала з Любярэцкага завода прывітальную тэлеграму ад беларускіх курсантаў-механікаў, якія авалодваюць тэхнікай машынізацыі сельскай гаспадаркі.

Пасля вячэрняга пасяджэння дэлегаты глядзелі кінокарціну «Падругі».

НА СЕСІІ СОВЕТА ЛІГІ НАЦЫЙ

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. М. М. ЛІТВІНАВА

па пытанню аб разрыве Уругваем адносін з СССР

ЖЭНЕВА, 23 студзеня. Сёння раніцай Совет Лігі нацый пад старшынствам аўстралійскага дэлегата **Брусэ** прыступіў да абгаварання совецкага звароту ў Лігу з поваду неўгрунтаванага разрыву дыпламатычных адносін з боку Уругвая. Першым слова было прадастаўлена наркому замежных спраў т. **Літвінаву**.

У пачатку сваёй прамовы т. Літвінаў падкрэсліў, што разрыў дыпламатычных адносін паміж Уругваем і Совецкім Саюзам мае агульны прынцыповы інтарэс. Ён ні ў якой меры не закранае інтарэсаў 170-мільённага насельніцтва Совецкага Саюза. Справа ў тым, што Уругвай парваў дыпламатычныя адносіны раптам, аднабакова, у духу варожасці, асноўваючы свае дзеянні на розных прэтэнзіях і абвінавачаннях. Такі разрыў адносін заўсёды лічыўся адным з самых варожых міжнародных актаў, і ўсякая дзяржава, якая ўсведамляе сваю адказнасць, абавязана растлумачыць такі акт сусветнай грамадскай думцы.

Паколькі Уругвай і Совецкі Саюз з'яўляюцца членамі Лігі нацый і звязаны статутам Лігі, паколькі разрыву не прадшэствавала ніякая працэдура, дык перад намі факт **рэзкага парушэння аднаго з асноўных артыкулаў статута Лігі нацый**.

Далей т. Літвінаў спыніўся на прэтэнзіях уругвайскага ўрада.

Першая прэтэнзія — адмаўленне совецкага ўрада прыняць высланага з Уругвая анархіста-тэрарыста Сімона Радавіцкага, паколькі ён не меў совецкага грамадзянства.

Адмаўленне совецкага ўрада прэзідэнт Уругвая прыняў, як асабістую крыўду. Пытанне аб Радавіцкім вырасла ва Уругваі ў своеасаблівую палітычную праблему.

Другая прэтэнзія — адмаўленне совецкага ўрада купіць пару сотень тон уругвайскага сыру. На куплі яго настойваў уругвайскі прэзідэнт, які лічыў, што гэта змякчыць крыўду, нанесеную яму адмаўленнем прыняць Радавіцкага.

Прэзідэнт Уругвая вытлумачыў і гэта адмаўленне, як новы акт няўважлівасці да яго.

Апрача гэтых двух прэтэнзій — адмаўлення ў прыняцці Радавіцкага і ў куплі сыру, — уругвайскі ўрад ніколі ніякіх іншых прэтэнзій не прад'яўляў. Ні разу ён не ўказваў на некалектыўны дзеянні совецкай місіі ў Монтэвідэо, або на іншыя выпадкі ўмяшання місіі ў мясцовыя справы.

Тым больш нечаканым з'яўляецца атрыманне совецкім пасланнікам ноты аб тым, што уругвайскі ўрад пастанавіў парваць дыпламатычныя адносіны з Совецкім Саюзам.

Тав. Літвінаў падкрэслівае бясспрэчнасць двух фактаў: **першы** — Уругвай парваў дыпламатычныя адносіны з Совецкім Саюзам; **другі** — ён не перадаў свае прэтэнзіі ні ў арбітраж, ні на разгляд совета Лігі, як гэтага патрабуе 12 артыкул статута.

— Я лічу, аднак, патрэбным заявіць, — гаворыць т. Літвінаў, — што прэтэнзіі да совецкага ўрада і совецкай місіі ў Монтэвідэо, ад якіх гаворыцца ва уругвайскай ноце, з'яўляюцца зусім не ўгрунтаванымі.

Далей тав. Літвінаў перайшоў да падрабязнага разгляду уругвайскай ноты. У ёй няма ні аднаго чоткага абвінавачання, ні аднаго канкрэтнага факту, які можна было-б паставіць у віну совецкай місіі.

У ноце ўказваецца, быццам «совецкі ўрад падбухторваў і аказваў дапамогу комуністычным элементам у Бразіліі праз совецкую місію». — Я заяўляю, — гаворыць тав. Літвінаў, што гэта сцвярджэнне зусім ілжывае. Ні совецкі ўрад, ні совецкая місія ў Монтэвідэо, ні якія-небудзь іншыя агенты совецкага ўрада не падбухторвалі і не аказвалі ніякай дапамогі комуністычным элементам ні ў Уругваі ні ў якой-бы там ні было суседняй з ім дзяржаве, ні наогул у якой-бы там ні было дзяржаве. Совецкі ўрад цвёрда і лаяльна праводзіць сваю палітыку неўмяшання ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў.

— Я патрабую ад уругвайскага ўрада, каб ён прадставіў свае доказы. І я загадзя сцвярджаю, што гэтых доказаў у яго няма і быць не можа.

Тав. Літвінаў катэгарычна абвяргае таксама абвінавачанне ў фінансаванні совецкай місіяй паўстання ў Бразіліі, выступае на аснове «пераданых інфармацый».

Уругвайскі ўрад не палічыў патрэбным нават атрымаць і праверыць гэтыя весткі, бо праверка паказала-б поўную неўгрунтаванасць гэтага абвінавачання. Совецкая місія за два гады свайго існавання атрымала на ўласныя патрэбы не больш 55.000 амерыканскіх долараў, прычым яна ніякіх грошай нікому па-за Уругваем не пераводзіла.

Тав. Літвінаў высмейвае разважанні уругвайскай ноты аб тым, што калі ў Бразіліі здарылася паўстанне, а ва Уругваі знаходзілася совецкая місія, дык паміж гэтымі двума з'явішчамі павінна існаваць сувязь. Таварыш Літвінаў напамінае, што ўся гісторыя Бразіліі і Уругвая за апошнія 50—60 год — гэта суцэльны ланцуг паўстанняў і пераваротаў, і што пяперашнія ўрады гэтых дзяржаў самі ўзніклі ў рэзультаце паўстанняў.

Пытанне аб разрыве адносін паміж Уругваем і СССР, — гаворыць тав. Літвінаў, — мае вялікі агульны інтарэс. Непаразумленні і канфлікты — звычайная з'ява ў міжнародным жыцці. Што стала-бы з міжнародным жыццём калі-б усе гэтыя пратэзіі не абгаварваліся паміж дзяржавамі, а вялі-б да разрыву адносін!

Уругвайскі ўрад безумоўна спекуляваў на вядомых забабонах, існуючых у рэакцыйных колах многіх краін супроць Совецкага Саюза. Усе краіны, вядомыя сваёй агрэсіўнай палітыкай, імкнуцца падобнай спекуляцыяй замаскаваць сваю агрэсію і свае заваяваўчыя планы.

Гэту спекуляцыю пачынае ўжываць у сваёй прасе адна з еўрапейскіх дзяржаў, толькі таму, што яе агрэсія не атрымала ўхвалення з боку совецкага ўрада.

— Мы павінны прызнаць, — гаворыць т. Літвінаў, — што падобныя спекуляцыі, з'яўляючыся зброяй агрэсіі, прадстаўляюць сабой велізарную небяспеку для ўсеагульнага міру. Таму нельга абмежкава аднесціся да дыпламатычных метадаў Уругвая.

Памяці В. В. КУЙБЫШЭВА

УЗОР ПРОЛЕТАРСКАГА РЭВОЛЮЦЫЯНЕРА

25 студзеня 1935 года на баявым пасту памёр адзін з выдатных пролетарскіх рэвалюцыянераў нашай эпохі, віднейшы дзеяч комуністычнай партыі і совецкай дзяржавы— Валерыян Владзіміравіч Куйбышэў. Памёр ён ад перанапружання ў рабоце, нечакана для ўсіх у росквіце сіл і кіпучай, біўшай праз край энергіі, — яму было ўсяго 47 гадоў.

Выхаваны з першых гадоў сваёй рэвалюцыйнай дзейнасці на вучэнні марксізма-ленінізма, верны вучань і саратнік Леніна і Сталіна, В. Куйбышэў належыць да слаўнага пакалення старой большэвіцкай гвардыі, да тых прафесіянальных рэвалюцыянераў, на якіх ляжала і ляжыць з самага пачатку існавання нашай партыі велізарная работа яе будаўніцтва, аховы яе чыстаты, яе адзінства, — такіх, як тав. Сталін, як Я. М. Свердлоў, як І. В. Бабушкін, як М. В. Фрунзе, як С. М. Кіраў.

Ленін высока цаніў В. Куйбышэва, як прафесіянальнага рэвалюцыянера, залоўга да пролетарскай рэвалюцыі паказаўшага сваю адданасць партыі. Калыскай рэвалюцыйнай дзейнасці гэтага выдатнага рэвалюцыянера, выхаваўшай яго, як і С. М. Кірава, з'яўляецца сібірскае падполле. Падростакам 13—14 гадоў пачаў В. В. Куйбышэў сваю рэвалюцыйную дзейнасць, арганізуючы сам гурток, наладжваў склад нелегальнай літаратуры ў скалах гары Кокшэ-Тау і раскідваючы пракламацыі сярод салдат вайсковай часці, якая знаходзілася пад камандай яго бацькі.

16 год В. Куйбышэў уваходзіць у Омскую арганізацыю РСДРП. Яшчэ будучы ў кадэцкім корпусе, ён не мог змаўчаць, калі ў студзеньскія дні 1905 г. па ўсёй краіне разнеслася вестка аб крывавым расстрэле мірнай дэманстрацыі рабочых у Пецербургу. Ён складае і падпісвае пратэст супроць ганебнасцей царскага самадзяржаўя.

В. Куйбышэва вабіць да сябе сталіца — Пецербург. Там, дзе самадзяржаўны дэспат праліваё кроў людзей, там марыць разгарнуць сваю рэвалюцыйную работу малады Валерыян Куйбышэў. Ваенна-медыцынская акадэмія — гэта-ж не галоўнае, дзеля чаго едзе Куйбышэў у сталіцу. Ён неадкладна ўступае ў большэвіцкую арганізацыю і бярэ на сябе небяспечнейшае даручэнне па пастаўцы зброі рабочым.

Будучы студэнтам Ваенна-медыцынскай акадэміі, В. Куйбышэў пымае гарачы ўдзел у студэнцкіх хваляваннях і вясною 1906 года яго медыцынская кар'ера заканчваецца выключэннем яго з акадэміі.

В. Куйбышэў вясною 1906 года зноў у омскім падполлі, як член Омскага камітэта большэвіцкай партыі і кіраўнік прапагандыцкай работай нелегальны прафесіянальны рэвалюцыянер. Ён вядзе прапаганду ў рабочых гуртках змагаецца супроць меншавікоў ачышчаючы ад іх арганізацыю, выкрывае правакатара Матушэйскага, сакратара Георгія Гапона, які прабраўся ў рэдакцыю газеты, вядзе работу ў Каінску, Барабінску, Петрапаўлаўску. Уся гэта кіпучая дзейнасць у радах сібірскага соцыял-дэмакратычнага саюза заканчваецца арыштам омскай гарадской канферэнцыі ў лістападзе 1906 года. Дзе В. Куйбышэў выступае з дакладам аб «рабочым з'ездзе» супроць меншавікоў.

* * *

Летам 1915 года В. Куйбышэў зноў пападае ў ссылку, у самую далёкую населеную мясцовасць Іркуцкай губерні — Тутуру, адкуль праз чатыры месяцы арганізоўвае пабег і прыязджае ў Самару, дзе ў гэты час большэвіцкай арганізацыяй кіравалі тт. Бубноў, Швернік. В. Куйбышэў з'яўляецца пад псеўдонімам Адамчыка. Спачатку ў якасці канторшчыка ў пякарні Нехлюціна, пасля памочнікам бухгалтара ў каперацыйным таварыстве «Самопомощь», а ў чэрвені 1916 года, пасля кароткага навучання, В. Куйбышэў-Адамчык становіцца кваліфікаваным фрэзероўшчыкам на Самарскім трубачным заводзе.

У верасні 1916 года Самарская арганізацыя склікае Паволжскую канферэнцыю. Арыштаваны на гэтай канферэнцыі В. Куйбышэў высылаецца на пяць гадоў у Туруханскі край. Прайшоўшы праз перасыльныя турмы Самары, Оранбурга, Чэлябінска, Нова-Нікалаеўска, Краснаярска і праз усе этапы да сяла Казачынскага, В. Куйбышэў быў вызвалены лютаўска-сакавіцкай рэвалюцыяй і 17 сакавіка вярнуўся ў Самару, стаўшы на чале Самарскага совета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Гэта багатае хваляваннямі, рэвалюцыйнымі падзеямі, насычанае барацьбою жыццё падпольшчыка В. Куйбышэва зрабіла з яго добрага таварыша, стойкага, загартаванага, праверанага ў самай рознастайнай абстаноўцы большэвіка.

Ужо ў самым пачатку рэвалюцыі ў Паволжы разгортваецца фронт грамадзянскай вайны, чэхаславацкае паўстанне, і Валерыян Куйбышэў становіцца камісарам 1-й рэвалюцыйнай арміі і членам Рэвваенсовета IV арміі, затым членам Рэвваенсовета паўднёвай групы Усходняга фронта, XI арміі і пад канец грамадзянскай вайны членам Рэвваенсовета Туркестанскага фронта. У гераічных паходах, у надзвычайна цяжкай абстаноўцы В. Куйбышэў разгортвае велізарныя здольнасці ваеннага арганізатара і камандзіра Чырвонай арміі. І ў Паволжы, і ў Сярэдняй Азіі, і наступаючы на ворага, і выводзячы з бою сілы, каб падрыхтавацца к новаму ўдару, В. Куйбышэў праяўляе выдатную вытрыманасць. Не адступаючы ні перад якімі труднасцямі ў гэтай барацьбе, ён дастойны саратнік Леніна і Сталіна.

А затым новая работа — прафсаюзная, якая набыла асаблівае велізарнае значэнне, калі ад перыяда ваеннага комунізма, ад ваеннай абстаноўкі краіна пачала пераходзіць да аднаўлення народнай гаспадаркі, да аднаўлення прамысловасці, калі трэба было ўмацаваць масавыя арганізацыі пролетарыята. І на гэтым участку работы, як і на наступным у якасці члена прэзідыума ВСНГ і начальніка Галоўэнерга, В. Куйбышэў не толькі набывае новы велізарны вопыт. Ён разгортвае ўсе свае здольнасці арганізатара народнай гаспадаркі.

На XI з'ездзе партыі тав. В. Куйбышэў выбіраецца ў члены Цэнтральнага Камітэта, становіцца сакратаром ЦК.

У момант, калі троцкісты аднаўляюць напад на партыю, В. Куйбышэў становіцца на чале рэарганізаванай ЦКК-РСІ. З таго часу, калі ў руля партыі стаў таварыш Сталін, т. Куйбышэў становіцца верным яго памочнікам у справе барацьбы за адзінства партыі, за поўную перамогу соцыялізма.

У разгар барацьбы за адзінства нашай партыі, калі смерць раптоўна ўносіць аднаго з выдатных людзей нашай рэвалюцыйнай эпохі, жалезнага рыцара — Фелікса Дзержынскага, на чале ВСНГ партыя ставіць В. Куйбышэва. В. Куйбышэў становіцца членам палітбюро — галоўнага штаба ВКП(б), яго ЦК.

В. Куйбышэў выконвае ў гэты перыяд самыя рознастайныя абавязкі. Ён старшыня Дзяржплана, намеснік старшыні Соўнаркома, а пасля 17 з'езда калі быў перабудован партыйны і совецкі кантроль, В. Куйбышэў становіцца і старшынём Камісіі совецкага кантроля.

Так жыццёвы шлях Валерыяна Владзіміравіча Куйбышэва. Ён увойдзе ў гісторыю нашай краіны, у гісторыю чалавецтва як адзін з слаўных дзеячоў новай эпохі, эпохі соцыялістычных пролетарскіх рэвалюцый.

З артыкула Е. ЯРАСЛАЎСКАГА.

Справа Леніна перамагла ў СССР канчаткова і беспаваротна

Даклад тав. А. І. СТЭЦКАГА ў Вялікім тэатры на ўрачыста-жалобным пасяджэнні, прысвечаным 12-й гадавіне смерці В. І. ЛЕНІНА, 21 студзеня 1936 года

Таварышы, мы ўсе ясна бачым і ўсведамляем, што ўступілі ў паласу новых вялікіх перамог ленінізма.

Уся наша социялістычная краіна ахоплена новым энтузіязмам, узнімаецца ўсё больш шырокія хвалі стаханаўскага руху, гэтага новага ўсенароднага руху ў барацьбе за пабудову комунізма. Як ніколі зараз апраўдваецца прадбачанне Леніна: «Але важна высвятліць сабе, як бясконца ілжыва звычайнае буржуазнае ўяўленне, быццам социялізм ёсць нешта мёртвае, застыўшае, раз на заўсёды данае, тады як на самой справе **толькі** з социялізма пачнецца быстры, сапраўдны, сапраўды масавы пры ўдзеле **большасці** насельніцтва, а потым усяго насельніцтва, адбываючыйся рух наперад ва ўсіх галінах грамадскага і асабістага жыцця». (Ленін, тв., т. XXI, стар. 439).

І калі кожны дзень прыносіць нам новыя факты социялістычнай творчасці і ў гаспадарцы, і ў культуры, факты новай народнай ініцыятывы, новыя прыклады беззаветнага гераізма, арганізаванасці і дысцыпліны народных мас, калі на нарадах у ЦК, у Сталіна, на сесіі ЦВК лепшыя людзі, героі, перадавікі з рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі ўсіх народаў Совецкага Саюза паведамляюць аб перамогах социялізма, — наша мысль зварачаецца к таму, хто ў нашай краіне палажыў пачатак гэтаму вялікаму руху, хто стварыў нашу слаўную пролетарскую партыю, хто стварыў Совецкую дзяржаву, хто натхніў рабочых і сялян ідэяй перамогі социялізма і ўказаў ім шляхі гэтай перамогі. Наша мысль зварачаецца да **Леніна**, які жыве і будзе жыць заўсёды ў свядомасці мільёнаў, у перамогах і барацьбе працоўных СССР і ўсяго свету. І калі цяпер справа социялізма ўзнята на гіганцкую вышыню і ззяе перад усім светам, калі яна цяпер цвёрда і непарушна, калі яе асновай з'яўляецца непахісны гранітны фундамент новых вытворчых адносін, то гэта таму, што Ленінская партыя цвёрда следавала запветам Леніна, што была сабрана ўся яе воля, каб выканаць указанні Леніна, што яна з усёй непрымірымасцю граміла агентуру ворагаў унутры партыі, што пад ленінскім кіраўніцтвам Сталіна яна накіравала ўсе сілы на ажыццяўленне ленінска-сталінскай ідэі перамогі социялізма ў нашай краіне.

Ленін нястомна натхняў нашу партыю, рабочы клас і ўсіх працоўных гэтай ідэяй перамогі социялізма.

У найцяжэйшых умовах разрухі і голаду, пад пагрозай германскага імперыялізма Ленін у артыкуле «Галоўная задача нашых дзён» зноў і зноў падкрэслівае гіганцкія магчымасці руху наперад, якія адкрывае Совецкі лад, указвае на тое, што наша краіна багата рознымі матэрыяламі і багацямі, што рэволюцыя дала выдатны размах народнай творчасці, заклікае з усёй энергіяй узяцца за работу ўмацавання дысцыпліны і самадысцыпліны, насаджаць арганізаванасць, дзеловітасць, стройнае супрацоўніцтва ўсенародных сіл, працаваць над стварэннем усеагульнага ўчоту і кантролю за вытворчасцю і размеркаваннем прадуктаў, збіраць камень за каменем моцны фундамент социялістычнага грамадства —«такі шлях да стварэння магутнасці ваеннай і магутнасці социялістычнай». «Гэта якраз тое, што патрабуецца Расійскай совецкай социялістычнай рэспубліцы, каб перастаць быць убогай і бяссільнай, каб беспаваротна стаць магутнай і багатай». (Ленін, тв., т. XXII, стар. 377—378).

Цяпер, праз дванаццаць год пасля смерці Уладзіміра Ільіча, партыя і народы СССР могуць даць справаздачу: магутнасць ваенная і магутнасць социялістычная створаны і мацнеюць з кожным годам. Рабочы клас разам з сялянствам, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, ператварыў убогую і бяссільную краіну ў краіну магутную і багатую, у краіну социялізма.

Выканан завет Леніна аб стварэнні буйнай машыннай індустрыі — базы социялізма. Нарады стаханаўцаў, камбайнераў, трактарыстаў, пленум ЦК і сесія ЦВК разгарнулі карпіну велічнай рэканструкцыйнай работы, якая ажыццяўляецца социялістычнай індустрыяй і стварае магутнасці нашай краіны, а таксама ўмовы для культурнага, заможнага жыцця грамадзян социялістычнай краіны. Выканан завет Леніна аб пераходзе да социялістычнай грамадскай гаспадаркі ў земляробстве. Калектывізацыя сялянскіх гаспадарак з поспехам завяршаецца, і буйная социялістычная гаспадарка ў земляробстве, і новая магутнейшая тэхніка, і самае галоўнае новыя людзі — калгаснікі, ствараюць небывалы і немагчымы ва ўмовах капіталізма, ва ўмовах дробнай аднаасобнай гаспадаркі, уздым земляробства.

Канчаткова і беспаваротна вырашана ўнутры краіны пытанне хто—каго, капіталістычныя элементы выцеснены з прамысловасці і гандлю, кулацтва як клас ліквідавана. У краіне пачаўся росквіт культуры, росквіт новага, бадзёрага, радаснага жыцця.

І VII кангрэс Комінтэрна, які сабраў лепшых барацьбітоў комунізма, змог канстатаваць, што справа Леніна — социялізм перамог у СССР канчаткова і беспаваротна і што гэта перамога социялізма ў СССР мае сусветна-гістарычнае значэнне, узнімае на новую вышыню барацьбу за комунізм ва ўсім свеце.

І вось цяпер не толькі з боку нашых братоў па класу, але і з боку людзей, чужых комунізму, мы чуем прызнанні нашых поспехаў. Множацца рады прыяцеляў СССР. Інтэлігенцыя капіталістычных краін бачыць, што социялізм — наперакор яе ранейшым уяўленням — не толькі не руйнуе і не пагашае культуры і навукі, што, наадварот, сапраўдны росквіт навукі, культуры, мастацтва пачынаецца толькі пры социялізме, што толькі пры социялізме магчымы і культурны ўздым шырокіх народных мас і шырокія магчымасці для творчасці, для праяўлення сваёй асабістай ініцыятывы, для развіцця ўсіх індывідуальных здольнасцей.

Выдатныя людзі еўрапейскай і амерыканскай інтэлігенцыі: Анры Барбюс, Рамэн Ралан, праф. Ланжэвен, Тэадор Драйзер, Томас Манн, Сінклер, Бернард Шоу, Сідней і Беатрыса Вебб, Андрэ Жыд і многія другія выдатныя людзі, творцы культуры і навукі выказваюць свае гарачыя сімпатыі народам СССР, якія будуюць социялізм. Яны бачаць цяпер, што ў СССР сапраўды разгарэлася новая прыгожая зара чалавецтва.

Зроблены рашаючыя крокі ў знішчэнні процілегласці паміж горадам і вёскай

Ленін гаварыў: «Ясна, што для поўнага знішчэння класаў трэба не толькі скінуць эксплаататараў, памешчыкаў і капіталістаў, не толькі адмяніць іх уласнасць, трэба адмяніць яшчэ і **ўсякую** прыватную ўласнасць на сродкі вытворчасці, трэба знішчыць як розніцу паміж горадам і вёскай, так і розніцу паміж людзьмі фізічнай і разумовай працы. Гэта— справа вельмі доўгая». (Ленін, тв. т. XXIV, стар. 337).

А ў накідцы праекта новай праграмы партыі які тэкстуальна і ўвайшоў у праграму, Ленін пісаў: «З прычыны таго, што процілегласць паміж горадам і вёскай з'яўляецца адной з самых глыбокіх асноў гаспадарчай і культурнай адсталасці вёскі, а ў эпоху такога глыбокага крызісу, як цяперашні (гэта пісалася ў 1919 г. — **А. С.**), ставіць як горад, так і вёску перад непасрэднай небяспекай выраджэння і гібелі, РКП бачыць у знішчэнні гэтай процілегласці адну з карэнных задач комуністычнага будаўніцтва...» (Ленін, тв., т. XXIV, стар. 107).

Тут мы сутыкаемся з буйнейшай праблемай сучаснасці. Процілегласць паміж горадам і вёскай з'яўляецца адным з найбольш рэзкіх і закончаных праяўленняў занявольваючага чалавека падзелу працы. Яна ўзнікла і развівалася на працягу тысячагоддзяў. Яна, даведзена да канца сучасным капіталізмам, які стварае гарады — спруты, індустрыяльныя капіталістычныя цэнтры з іх гарадскім жабрацтвам, антысанітарнымі ўмовамі для мас, абяскроўлівае і атупляе вёску. Мы бачым як жменька высока-індустрыяльных краін занявольвае сотні мільёнаў адсталых народаў Азіі, Афрыкі і Паўднёвай Амерыкі.

Асновапаложнікі навуковага социялізма Маркс і Энгельс, а разам з імі Ленін і Сталін заўсёды ўказвалі, што гэта процілегласць паміж горадам і вёскай увекавечвае адсталасць, жабрацтва і цемру вёскі, што яна атупляе вёску, нараджае ідыятызм вясковага жыцця вядзе да выраджэння масы гарадскога насельніцтва, ператварае адных людзей у абмежаваных гарадскіх жывёлін, другіх — у абмежаваных вясковых жывёлін.

І вось наша социялістычная краіна пад кіраўніцтвам Сталіна моцна стала на шлях рашэння гэтай гіганцкай праблемы: на шлях знішчэння процілегласці паміж горадам і вёскай, ператварэння сельскагаспадарчай працы ў рознавіднасць працы індустрыяльнай.

І іменна за апошнія гады, за гады сталінскіх пяцігодак, у сувязі з калектывізацыяй, ліквідацыяй кулацтва, у сувязі з узбраеннем калгасаў і соўгасаў — справа рушылася быстра наперад, і гэты рух адчуваюць і перажываюць нашы калгаснікі. У сельскагаспадарчых раёнах разгорнута сетка машына-трактарных станцый. На 1936 год іх будзе 4.951, прычым яны ахопяць 80 проц. калгасных палёў. У сельскай гаспадарцы працуе 350 тысяч трактараў магутнасцю ў 6.543 тыс. конскіх сіл, прычым у 1936 годзе гэты парк атрымлівае новае папаўненне ў 1.933 тыс. конскіх сіл. Механічная цяга ў адносінах да жывой у калгасах складае ўжо 51 проц. Социялістычная сельская гаспадарка мае ўжо ў вялікай колькасці такія ўдасканаленыя машыны, як камбайн. Наша прамысловасць для вёскі ў мінулым годзе дала 20,1 тысяч камбайнаў і ў новым годзе дасць 60 тысяч, прычым у соўгасах уборка ўжо палкам праводзіцца пры дапамозе камбайнаў. Наша дзяржава снабжае вёску рознастайнейшымі машынамі (бульба - і буракакапальныя машыны, бавоўнаўборачныя і многа іншых), знішчаючымі ранейшую варварскую атупляючую вясковую працу.

Перш за ўсіх і больш за ўсіх клапоціцца аб гэтым таварыш Сталін. Ён паставіў пытанне аб тым, каб палегчыць цяжкую працу мільёнаў сялян і сялянак, маладых і старых, і кожны год ён адстойвае для вёскі вышэйшыя нормы вытворчасці машын, трактараў, камбайнераў, сеялак і інш.

Новыя людзі паявіліся ў совецкай вёсцы — людзі, якія авалодваюць тэхнікай, якія кіруюць трактарамі, камбайнамі, аўтамашынамі, якія ўзнімаюцца ў сваім развіцці, у веданні тэхнікі, у сваёй культуры, у дысцыпліне працы на ўзровень перадавых рабочых нашых індустрыяльных цэнтраў. Звыш двух мільёнаў трактарыстаў, камбайнераў падрыхтавана ў вёсцы за гады першай і другой пяцігодкі. Звыш двух мільёнаў арганізатараў социялістычных прадпрыемстваў у земляробстве, брыгадзіраў, старшынь калгасаў і іншых работнікаў, прайшлі ўсякага роду курсы.

Вёска распе культурна. Пашыраецца сетка школ і больніц, сетка кіноўстановак і радыёпунктаў. Расце калгасная культурная самадзейнасць. Як далёкі тыя яшчэ нядаўнія часы, калі лепшыя людзі рускай інтэлігенцыі ў роспачы канстатавалі неймаверную забітасць рускай вёскі, адзначалі жабрацтва і беднасць, якія настолькі абмяжоўвалі светапогляд селяніна, што ён нават не прадстаўляў сабе, не меў нават паняцця аб культурных патрэбнасцях.

Гэтыя патрэбнасці паявіліся цяпер з усёй сілай у рэзультаце пролетарскай рэволюцыі. Социялістычная вёска хоча жыць культурна, і яна прад'яўляе гораду свой растучы попыт.

Лепшыя людзі совецкай вёскі ведаюць, куды ім трэба трымаць шлях. Камбайнер тав. Палагуцін з Саратаўскага края заявіў на нарадзе ў таварыша Сталіна: «Вось мы зараз прыязджаем у Маскву і бачым, што ў Маскве жывуць добра, культурна, **а мы хочам, каб наша вёска жыла, як Масква. Мы хочам вёску параўнаць з Масквой...** І мы гэта зробім». Так разумеюць цяпер гэту праблему — знішчэнне процілегласці паміж горадам і вёскай, праблему раней сугуба тэарэтычную, перадавыя людзі калгасаў. Яны адразу ставяць яе абедзьма нагамі на глебу практычнай справы. Яны ўпэўнены, як ніколі, што ў бліжэйшыя гады совецкая вёска сапраўды стане культурнай і заможнай.

Завяршаем пабудову бясклясавага социялістычнага грамадства

Выкананне непасрэдных заветаў Леніна, поспехі социялістычнага будаўніцтва, перамога социялізма ў СССР знамянуюць, што на цяперашняй ступені партыя Леніна—Сталіна ўшчыльную падышла ўжо к выкананню тых задач, тых указанняў Леніна, якія разлічаны былі не толькі на пераходны ад капіталізма да социялізма перыяд, але якія ахапляюць і перыяд першай фазы комуністычнага грамадства.

Гэта — найвялікшая сусветна-гістарычная заваёва партыі Леніна—Сталіна.

Ленін вучыў партыю:

«Социялізм ёсць знішчэнне класаў.

Каб знішчыць класы, трэба, па-першае, скінуць памешчыкаў і капіталістаў. Гэту частку задачы мы выканалі, але гэта толькі частка і пры тым **не** самая трудная. Каб знішчыць класы, трэба, па-другое, знішчыць розніцу паміж рабочым і селянінам, зрабіць **усіх — работнікамі**. Гэтага нельга зрабіць адразу. Гэта задача — непараўнальна больш трудная і з прычыны неабходнасці, працяжная. Гэта — задача, якую нельга вырашыць звяржэннем якога-б там ні было класа. Яе можна вырашыць толькі арганізацыйнай перабудовай усёй грамадскай гаспадаркі, пераходам ад адзіночнай, абасобленай, дробнай таварнай гаспадаркі да грамадскай буйнай гаспадаркі». (Ленін, тв., т. XXIV, стар. 511).

І вось гэта задача, якую Ленін лічыў трудней шаў і ў той-жа час удзячнейшай задачай пролетарскай рэволюцыі, у асноўным вырашана. Кулацтва і астаткі эксплаатуемых класаў ліквідаваны. У сучасны момант калектывізацыяй ахоплена 90 проц. сялянскіх гаспадарак. Социяльная аснова нашай дзяржавы змянілася, бо цяпер гэтай асновай з'яўляецца социялістычная гаспадарка. І рабочыя, і калгаснікі, і астатнія працоўныя — яны з'яўляюцца цяпер непасрэднымі будаўнікамі социялістычнай гаспадаркі. Асновай іх жыцця, асновай іх уздыму культурнага і матэрыяльнага з'яўляецца іх праца на дзяржаўных прадпрыемствах, у калгасах і соўгасах, у прадпрыемствах дзяржаўнага і кааперацыйнага гандлю — іншымі словамі, у прадпрыемствах социялістычных.

На нашых вачах побач з перадавікамі, героямі социялістычнай працы з рабочых у горадзе растуць і множацца рады перадавых социялістычных работнікаў—герояў і ў вёсцы, сярод калгаснікаў. Яны — прыклад для ўсёй масы калгаснікаў.

У рэзультаце новай тэхнікі, социялістычнай арганізацыі працы, адбываецца прадсказанае Леніным азнараўленне псіхалогіі дробнага селяніна, выкараненне дробна-ўласніцкіх, рвацкіх, спекулянцкіх прывычак і навыкаў.

Разам з тым, у нашай краіне распе нястрымна маладое пакаленне, якое выхоўваецца ў комуністычным духу, якому ў масе варожы праклятыя варварскія звычаі і прывычкі капіталістычнага грамадства. Гэта маладое пакаленне з малых год ужо атрымлівае зачаткі комуністычнай свядомасці, што мы можам наглядаць нават сярод дзяцей. Нядаўна расказвалася ў «Правде», як пяцігадовы малы пытае матку: «Чый гэта слон?». Маці адказвае — «дзяржаўны». Малы ў адказ: «Раз дзяржаўны, значыць ён крыху і мой». Гэта новая моладзь ужо ў комсамольскім узросце дае ўдарнікаў-стаханаўцаў, маладых вучоных, рухаючых совецкую навуку, парашутыстаў, лётчыкаў і фізкультурнікаў, ставячых сусветныя рэкорды, яна папаўняе рады слаўнай Чырвонай арміі, авалодваючы тэхнікай абароны і рыхтуючыся, у выпадку патрэбы, аддаць сябе палкам для абароны, для перамогі справы Леніна.

Ленін заклікаў нас, аднак, заўсёды правільна ўлічваць асаблівасці кожнай ступені, уважліва аналізаваць сапраўдныя адносіны і інтарэсы людзей, не ганарыцца, не зазнавацца.

І зараз, устанаўляючы той бясспрэчны факт, што гаспадарка ў нас стала социялістычнай, што рознастайнасць гаспадарчых укладаў у нашай краіне пераможана і перамог уклад социялістычны і што ў гэтым сэнсе задача знішчэння класаў выраблена—мы павінны цвёрда памятаць, што варожыя нам элементы, як указвае таварыш Сталін, як падкрэсліў на сесіі ЦВК таварыш Молатаў, яшчэ не вывяліся ў нашай краіне. Гэтыя элементы жывяцца падтрыманнем і заахвочваннем з боку нашых ворагаў з-за граніцы, з фашысцкіх штабаў. Было-б злачынствам з нашага боку паслабляць рэволюцыйную пільнасць. Зброя пролетарскай дыктатуры павінна быць заўсёды напагатове супроць тых, хто яшчэ спрабуе каваць загаворы супроць пролетарскай дыктатуры і пакаспіць нам.

Не трэба таксама забываць, што яшчэ існуюць класавыя адрозненні паміж рабочымі і калгаснікамі, паколькі калгасы яшчэ не з'яўляюцца прадпрыемствамі паслядоўна-социялістычнага тыпу, паколькі ў калгаснікаў ёсць і свая індывідуальная гаспадарка і дробная ўласнасць, паколькі яны яшчэ не вызваліліся да канца ад навыкаў і перажыткаў дробнаўласніцкай, прыватнай гаспадаркі.

Таму задачы выхавання социялістычнага ўсведамлення знішчэння перажыткаў капіталізма і ў эканоміцы і ў свядомасці людзей—стаяць ва ўвесь рост перад партыяй, перад рабочым класам, як авангардам працоўных, перад пролетарскай дыктатурай.

Нам прадстаіць яшчэ давесці да канца і завяршыць пераможна барацьбу супроць сіл прывычак і традыцый старога грамадства, без чаго немагчымы поўны комунізм.

Культурна-тэхнічны ўздым рабочага класа і падрыхтоўка ўмоў для знішчэння процілегласці паміж разумовай і фізічнай працай

Ленін гаварыў: «Прадукцыйнасць працы, гэта ў апошнім разрахунку, самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадскага ладу. Капіталізм стварыў прадукцыйнасць працы, небывалую пры рыгонніцтве. Капіталізм можа быць канчаткова пераможан і будзе канчаткова пераможан тым, што социялізм стварае новую, значна больш высокую прадукцыйнасць працы. Гэта — справа вельмі трудная і вельмі доўгая, **але яна пачата**, вось у чым самае галоўнае. Калі ў галоднай Маскве летам 1919 г. галодныя рабочыя, перажыўшыя цяжкіх чатыры гады імперыялістычнай вайны, потым паўтара года яшчэ больш цяжкай грамадзянскай вайны, змаглі пачаць гэту вялікую справу, то якое будзе развіццё далей, калі мы пераможам у грамадзянскай вайне і завоюем свет?» (Ленін, тв., том XXIV, стар. 342).

На нашых вачах разгортваецца зараз у новай фазе барацьба за высокую социялістычную прадукцыйнасць працы.

Наша краіна жыве пад знакам велічнага стаханаўскага руху, які становіцца ўсенародным рухам. Гэты рух, які з'яўляецца рэзультатам усёй работы нашай партыі, яе ленінскага кіраўніцтва, складае самае выдатнае дасягненне другой пяцігодкі. Перадавікі рабочага класа, рабочыя-стаханаўцы, героі новай социялістычнай прадукцыйнасці працы, авалодваючыя новай тэхнікай і вытворчай культурай, выконваюць важнейшы завет Леніна. Яны — сапраўдныя ленінцы, сталінцы. Яны па праву носяць вышэйшы знак пашаны ў нашай краіне, ордэн Леніна.

Геній Леніна ўбачыў у першым комуністычным суботніку на Маскоўска-Казанскай чыгунцы падзею сусветна-гістарычнага значэння, пачатак перавароту, які зробіць комунізм непераможным.

Ленін гаварыў, што гэты першы суботнік «мае большае гістарычнае значэнне, чым любая перамога Гіндэнбурга або Фоша і англічан у імперыялістцкай вайне 1914—1918 гадоў. Перамогі імперыялістаў ёсць бойня мільёнаў рабочых з-за прыбыткаў англа-амерыканскіх і французскіх мільярдэраў, ёсць зверства гнючага, абажраўшагася, зажыва гніючага капіталізма. Комуністычны суботнік чыгуначных рабочых Маскоўска-Казанскай чыгункі ёсць адна з ячэек новага, социялістычнага, грамадства, якое нясе ўсім народам зямлі выбаўленне ад ярма капіталізма і ад войнаў» (Ленін, тв., т. XXIV, стар. 339—340).

Гэта былі зачаткі комуністычнай працы ў зруйнаванай і галоднай краіне.

Цяпер на аснове новай тэхнікі, новай культуры рабочага класа гэтыя зачаткі разрасліся ў шырокі ўсесаюзны рух, у такі рух, які стварае прадукцыйнасць працы больш высокую, чым пры капіталізме.

Гістарычны сэнс гэтага руху быў ускрыт на нарадзе ў прамове таварыша **Сталіна**, якая азарыла стаханаўскі рух новым святлом і дазволіла бачыць у ім тое, што было не пад сілу звычайнаму воку.

Таварыш **Сталін** у сваёй прамове гаварыў аб тым, як ініцыятыва і творчасць рабочых мас у 1905 годзе стварылі **Советы рабочых дэпутатаў.** Але патрэбен быў геній **Леніна** для таго, каб адкрыць у Советах сусветна-гістарычную форму пролетарскай дыктатуры, паказаць тое значэнне, якое **Советы** маюць у справе стварэння пролетарскай рэволюцыі і ў справе пераходу ад капіталізма да социялізма.

Тое-ж трэба сказаць і аб **стаханаўскім руху.** Сусветна-гістарычнае значэнне гэтага руху, які створан ініцыятывай і творчасцю рабочых мас, відаць толькі цяпер, пасля таго, як таварыш **Сталін** ускрыў сутнасць стаханаўскага руху. Бо не сакрэт-жа, што знаходзіліся людзі, якія гаварылі, што стаханаўскія метады прымяніміы толькі ў Данбасе, што нам, моў, няма чаго думаць аб стаханаўскіх метадах, бо ў нас і так план выконваецца і злёгку перавыконваецца.

Але нават там, дзе гэты рух і быў падхоплен, яго велізарнае значэнне расцэньвалася толькі з пункту гледжання павышэння прадукцыйнасці працы. Патрэбна была празорлівасць генія для таго, каб у гэтым вопыце перадавікоў, які ахапляе цяпер усе галіны фабрыкі і заводы і ператвараецца ў магутны народны рух, убачыць зародкі, зярно і ўмовы для пераходу да той канчатковай мэты, якую партыя комуністаў напісала на сваім баявым сцягу, — для пераходу к **комунізму.**

Гэты выдатны рух мог узнікнуць толькі ў нашай краіне. Нідзе, ні ў якай іншай краіне такі рух немыслімы. У краінах капітала, дзе ўсё аснавана на эксплаатацыі, дзе панае самая жорсткая класавая барацьба, дзе для рабочых фабрыка з'яўляецца капіталістычнай катаргай, дзе машына з'яўляецца авешчаствлёным капіталам, які высмоктвае з рабочага жыццё, — там не можа быць ні масавай ініцыятывы, ні масавага руху з боку рабочых, працоўных за павышэнне прадукцыйнасці працы.

Наадварот, там кожнае павышэнне прадукцыйнасці працы, кожнае новае вынаходства, кожнае новае ўдасканаленне, новыя машыны — там усё гэта суправаджаецца найвялікшымі лішэннямі, разарэннем рабочага класа, павелічэннем жабрацтва і пакут для працоўнага насельніцтва.

Аб тым, як пагібельна адзываецца на рабочым усякае ўдасканаленне машыны, або ўвядзенне новай машыны пры капіталізме, **Маркс** пісаў наступнае:

«Усе знаходзячыеся ў здаровым розуме прадстаўнікі палітычнай эканоміі прызнаюць, што, калі ўводзіцца нанава машына, гэта дзейнічае як чума на рабочых тых традыцыйных рамёслаў і мануфактур, з якімі яна перш за ўсё ўступае ў канкурэнцыю». («Капітал», т. I, стар. 500, выд. 1934 г.).

На старонках «Капітала» Маркс раскрывае трагічную гісторыю таго, як англійскія ткачы ў 40—50 гадах у выніку ўвядзення новых машын былі зруйнаваны, як многія з іх на працягу дзесяткаў год павінны былі пягнуць мізэрнае існаванне і чакаць галоднай смерці.

Ён прыводзіў сведчыя паказанні віцэ-губернатара Ост-Індыі, які ў сваім данясенні паведамляў, што ў выніку ўвядзення ткацкіх варштатаў раўніны Ост-Індыі бялеюць касцямі ручных ткачоў.

Маркс піша:

«Калі машына паступова авалодвае пэўнай сферай вытворчасці, яна стварае хранічнае жабрацтва ў канкуруючых з ёю слаях рабочых. Калі пераход адбываецца быстра, яе дзеянне носіць масавы і востры характар.

Сусветная гісторыя не дае больш жудаснага відовішча, чым павольная, якая зацягнулася на дзесяцігоддзі і завяршылася, нарэшце у 1838 г. гібель англійскіх ручных баваўнянапапяровых ткачоў. Многія з іх памерлі галоднай смерцю, многія доўга пакутавалі са сваімі сем'ямі на 2½ пенса ў дзень. Наадварот, англійскія баваўнянапапяровыя машыны зрабілі вострае дзеянне на Ост-Індыю, генерал-губернатар якой канстатаваў у 1834—1835 гг.: «Бядоце гэтай наўрад ці знойдзецца аналогія ў гісторыі гандлю. **Раўніны Індыі бялеюць касцямі ткачоў баваўны».** («Капітал», т. I, стар. 483—484, выд. 1934 г.).

Апісваючы і аналізуючы развіццё капіталістычнага грамадства, **Маркс** устанаўляе, што ўвядзенне машын, павелічэнне пастаяннага капітала вядуць да стварэння і павелічэння рэзервовай прамысловай арміі, г. зн. арміі беспрацоўных. Па меры таго, як на адным полюсе расце і канцэнтруецца грамадскае багацце, на другім полюсе павялічваюцца пакуты, жабрацтва масы, павялічваецца армія беспрацоўных.

Можа быць, скажуць, што Маркс пісаў аб гэтым даўно, што гэта адносіцца да таго часу, калі капіталізм ішоў на ўздым і выцясняў іншыя формы вытворчасці, што цяпер іншае становішча. Між тым, іменна цяпер, калі капіталізм знаходзіцца ў сваёй апошняй стадыі — у стадыі імперыялізма, у стадыі агульнага крызісу, — гэтыя нечуваныя пакуты для працоўных мас павялічыліся ў шмат разоў. Калі раней рэзервовая армія налічвала сотні тысяч чалавек, то зараз яна налічвае мільёны.

За апошнія гады — гады крызісу — у краінах капіталізма быў уведзен цэлы рад тэхнічных удасканаленняў, і ў Англіі, напрыклад, вытворчасць некалькі ўзнялася і дасягнула ўзроўню 1929 года.

Але да чаго гэта прывяло?

У 1929 годзе колькасць рабочых, якія былі за бартом вытворчасці, складала нямногім больш мільёна чалавек, а ў сучасны момант у арміі беспрацоўных, у арміі жабрацтва, у той арміі, якая не мае ніякіх надзей на будучыню, у гэтай арміі знаходзіцца ў Англіі звыш 2 мільёнаў чалавек. У Злучаных штатах Амерыкі беспрацоўных — без членаў сям'і — налічваецца 11 мільёнаў.

У справаздачы Лігі нацый за 1934—1935 год можна прачытаць наступнае: «...беспрацоўе ў 1934 годзе было ў два з лішкам разы вышэй, чым у 1929 годзе. Прадстаўляецца неабвержным вывад, што калі не адбудзецца якога-небудзь значнага расшырэння гандлю, то, не гледзячы на значнае расшырэнне прадукцыі, усё-ж ва ўсіх капіталістычных краінах застанецца **пастаянная язва беспрацоўя».**

Такім чынам, тое, што гаварыў Маркс з яшчэ большай сілай дзейнічае цяпер. Вынаходствы, удасканаленні, увядзенне новай машыны ва ўмовах капіталізма дзейнічаюць на рабочых, як чума, суправаджаюцца найвялікшымі пакутамі для рабочых мас. Таму і не можа быць у рабочых капіталістычных краін імкнення да павышэння прадукцыйнасці працы, масавага руху за лепшыя паказальнікі работы. Калі рабочы і ўзнімае там прадукцыйнасць працы, то ён гэта робіць з-пад палкі, ён робіць гэта толькі таму, што баіцца быць выкінутым з фабрыкі і аказацца ў арміі беспрацоўных.

Ясна, што толькі ў нашай краіне, якая пакончыла з капіталістычнай катаргай, якая разграміла назаўсёды лад эксплаатацыі, выгнала капіталістычных рабаўладальнікаў, якая паставіла сваёй мэтай культурна-тэхнічны і палітычны ўздым рабочага класа, якая паставіла сваёй мэтай знішчэнне процілегласці паміж разумовай і фізічнай працай — магчыма тое, што мы называем стаханаўскім рухам. Толькі ў нашай краіне магчымы гэты вялікі ўздым народных мас, іх клопаты аб прадукцыйнасці працы, іх клопаты аб павелічэнні грамадскага багацця. Усё гэта магчыма ў нас таму, што наш лад аснаван на зусім іншых пачатках арганізацыі грамадскай працы.

На нарадзе перадавых камбайнераў і камбайнерак таварыш **Сталін** паказаў на прыкладзе камбайна, што азначае ў нашай краіне ўсякае **ўдасканаленне машын і ўвядзенне новай машыны.**

«Самі ведаеце, — гаварыў таварыш **Сталін** на гэтай нарадзе, — што ўборка пры дапамозе лабагрэйкі дае велізарныя страты зярна. Спачатку скасіць, потым сабраць у снапы, потым сабраць у спірты, потым звазіць ураджай да малатарань, — усё гэта страты і страты. Усе прызнаюць, што пры гэтай сістэме ўборкі мы трацім каля 20—25 проц. ураджаю. Вялікае значэнне камбайна заключаецца ў тым, што ён дазводзіць гэтыя страты да нязначнага мінімуму. Знаўцы справы гавораць, што ўборка пры дапамозе лабагрэйкі, пры іншых розных умовах, дае ўраджайнасць на гектар на 10 пудоў менш, чым уборка пры дапамозе камбайна. Калі ўзяць 100 мільёнаў гектараў зернавых пасеваў, а іх у нас значна больш, як вядома, то страты пры ўборцы лабагрэйкамі складуць мільярд пудоў зярна. Спрабуйце цяпер арганізаваць уборку на гэтых 100 мільёнах гектараў пры дапамозе камбайна маючы на ўвазе, што камбайн працуе не дрэнна, — і вы атрымаеце выйгрыш на цэлы мільярд пудоў зярна. Лічба немалая, як бачыце.

Вось да чаго вялікае значэнне камбайна і людзей, працуючых на камбайне».

Ці знойдзецца ў нас хоць адзін чалавек, які не будзе рукапляскаць такой машыне і які не падыме абедзве рукі за тое, каб было больш машын, за тое, каб дабіцца такім шляхам лішняга мільярда пудоў хлеба? Хіба хто-небудзь можа падумаць аб тым, што ў нас магчыма беспрацоўе ці крызіс ці што гэта машына можа выклікаць нейкае разарэнне?

Пры капіталізме машына, як гаворыць Маркс, — гэта чума для

(ПРАЦЯГ ДАКЛАДА тав. А. І. СТЭЦКАГА НА 3 стар.).

ПРАЦЯГ ДАКЛАДА таварыша А. І. СТЭЦКАГА

рабочых. Там машына з'яўляецца зброяй эксплаатацыі. У нас машына павялічвае багацці, якія мае рабочы клас. Таму нашы рабочыя вітаюць усякую новую, удасканаленую машыну; таму ў нас з'яўляецца героем той, хто ўмее лепш уладаць гэтай машынай.

У сваёй вядомай брашуры «Наёмная праца і капітал» Маркс піша, што пры капіталізме рабочы «не лічыць працу часткай свайго жыцця, наадварот, працаваць— значыць для яго афяраваць жыццём». Ці лічыць рабочы, «які 12 гадзін у суткі тчэ, прадзе, свідруе, точыць, будуе, капае, разбівае каменні, пераносіць цяжары і т. д., — ці лічыць ён гэта 12-гадзіннае ткание, прадзенне, свідраванне, такарную работу, капанне, разбіванне каменняў праяўленнем свайго жыцця, жыццём? Наадварот, жыццё для яго пачынаецца тады, калі гэта дзейнасць спыняецца, — за абедзеным сталом, на тракцірнай лаўцы, у пасцелі». (К. Маркс, выбраныя творы ў 2-х томах, т. І, стар. 192).

Новыя адносіны, створаныя перамогай социялізма ў нашай краіне, у корані мяняюць адносіны работніка да працы. Сапраўды социялістычныя адносіны нашага рабочага да працы праяўляюцца ў тым энтузіязме, у той сапраўднай любві, у найвялікшай адданасці, з якімі рабочы падыходзіць да свайго завода, да свайго варштата, да сваёй работы. «Наша фабрыка — сапраўды социялістычнае ва ўсіх адносінах прадпрыемства! Я люблю сваю фабрыку, люблю сваю краіну, люблю працу — вось чаму я магу даваць яшчэ большыя паказальнікі!» — так гаварыў на стаханаўскай нарадзе стаханавец Сметанін.

У нас кожнаму рабочаму ясна, што ён працуе на социялістычную краіну; у нас кожны ведае, што яго праца з'яўляецца частачкай усёй калектыўнай грамадскай працы народаў Совецкага Саюза, што ўсе сродкі вытворчасці знаходзяцца ў грамадскай уласнасці.

Нашы адносіны, адносіны ў нашай социялістычнай краіне, не закрыты ніякімі завесамі таварнага фетышызма, ніякімі грашовымі і таварнымі адносінамі. У нас кожны рабочы, кожны калгаснік ведае, што, працуючы на сваім участку, павялічваючы багацці сваёй социялістычнай краіны, ён стварае і сабе ўмовы для заможнага, для багатага жыцця. У нас наступіў той перыяд, аб якім гаварылі настаўнікі социялізма, калі ўсе адносіны становяцца яснымі і празрыстымі, калі няма месца сляпым, стыхійным законам, калі кожны ведае, што ён з'яўляецца частачкай грамадства, частачкай адной працоўнай сям'і і ён працуе для сябе і на сваю працоўную сям'ю.

Вось чаму таварыш **Сталін** гаварыў аб тым, што кожны, **хто працуе добра, хто робіць, хто паказвае ўзоры прадукцыйнасці працы, з'яўляецца паважаным грамадскім дзеячом, героем, бо ў нас праца — гэта грамадская, социялістычная праца, і яна з'яўляецца справай чэсці, справай славы, справай доблесці і геройства.**

Тое, што было па нарадзе стаханаўцаў — там, дзе выступалі піонеры социялістычнай арганізацыі працы, героі новага грамадскага ладу, — гэта адно з найвялікшых дасягненняў социялістычнага будаўніцтва. Гэта і ёсць социялізм.

Таварыш **Сталін**, гаворачы ў сваім выступленні адносна значэння і характару стаханаўскага руху, падкрэсліў, што гэты рух быў-бы немыслімы ў сучасны момант, калі-б **не новая тэхніка**, якая была створана за апошні час.

Новая тэхніка, якая створана ў нашай краіне, і з'явілася адной з неабходных умоў стаханаўскага руху. Але таварыш Сталін гаварыў, што гэта тэхніка засталася-б мёртвай, калі-б у нас не паявіліся **новыя людзі**, якія **аўладалі** гэтай тэхнікай, людзі, якіх **выхавала наша партыя**, якія высока падняліся ў сваім **культурна-тэхнічным росце.**

Піонеры і перадавікі стаханаўскага руху — гэта людзі, якія атрымалі падрыхтоўку, прайшлі тэхнічныя курсы, агульнаасветную школу і добра вывучылі свой варштат. Іменна на гэтай аснове, на аснове павышэння культурна-тэхнічнага ўзроўню рабочага класа, сталі магчымымі тыя рэзультаты, тыя дасягненні, тое разгортванне стаханаўскага руху, якія мы маем у сучасны момант.

Многія нашы заводы з'яўляюцца велізарнымі школамі, цэлымі вучэбнымі камбінатамі, свайго роду вучэбнымі лабараторыямі, дзе абучаюцца тэхніцы, палітычнай грамаце і агульнаасветным навукам тысячы, а часамі і дзесяткі тысяч людзей. Вось, напрыклад, маскоўскім аўтамабільным заводзе імя Сталіна з 28.569 рабочых вучыцца 13.000 чал. Тэхнічнай вучобай на гэтым заводзе ахоплена звыш 6.000 чал., агульнаасветнай — звыш 1.500 чал., палітвучобай — 4.313 чал. Пры заводзе ёсць вячэрні рабфак і вячэрні тэхнікум. На маскоўскім варштатазаводзе імя Орджанікідзе з 3.965 рабочых вучацца ў тэхнічных і агульнаасветных гуртках, на рабфаках і ў ВНУ 2.338 чал., ды апрача таго 696 — вучацца ў сетцы палітасветы. На заводзе ствараецца сярэдняя і вышэйшая тэхнічная школа на 800 чал. На ленінградскім заводзе імя Кірава (б. Пупілаўскі завод) вучобай ахоплена 10.560 чал. Рознага роду тэхнічнымі гурткамі, курсамі, рабфакамі, тэхнікумамі і ленінградскімі ВНУ ў 1934 годзе было выпушчана 2.108 рабочых гэтага завода. У 1935 годзе на кіраўскім заводзе было выпушчана яшчэ больш—11.326 чал., з іх 8.331 рабочы здаў тэхмінімум. На ленінградскім заводзе «Электросила» імя Кірава таксама ёсць цэлы камбінат тэхнічнай вучобы, у склад якога ўваходзяць тэхнікум і ВТНУ, рабфак, розныя курсы і гурткі, якімі ахоплена звыш 3.000 чал.

Вось, таварышы, тая велізарная сістэма тэхнічнай і ўсякай іншай вучобы, якую праходзяць у сучасны момант совецкія рабочыя, дзе яны атрымліваюць новую падрыхтоўку, тэхнічную кваліфікацыю і павышаюць свой тэхнічны ўзровень.

Пленум ЦК ВКП(б) даў у сваёй рэзалюцыі вельмі дакладнае ўказанне на тое, што трэба ўзнімаць і расшыраць гэту сетку тэхнічных курсаў, для таго, каб ахапіць больш рабочых, для таго, каб выканаць тую задачу, якая пастаўлена таварышам **Сталіным** у яго прамове на нарадзе стаханаўцаў.

Трэба паміма гэтага мець на ўвазе, што ў нас распе маладое пакаленне — 28 мільёнаў дзяцей вучацца зараз у пачатковай і сярэдняй школах. Па некаторых папярэдніх разліках таварышоў з Дзяржплана мы ўжо ў сучасны момант можам сказаць, што з пяперашняй моладзі ва ўзросце ад 18 да 30 год, каля адной пятай часткі ў колькасці 7 мільёнаў чалавек будуць мець к 1941 году ўзровень інжынерна-тэхнічных работнікаў (замест 1,7 мільёна ў 1936 г.).

Трэба думаць, што гэта пяцігодка будзе таксама перавыкананa, як і іншыя пяцігодкі.

Культурны, тэхнічны ўзровень рабочага класа ўзнімаецца з года ў год — і гэта адна з умоў стаханаўскага руху. Тут якраз і закладзена тое вялікае значэнне стаханаўскага руху, аб якім гаварыў таварыш **Сталін.** Таварыш Сталін сказаў, што тут у стаханаўскім руху, у гэтым культурна-тэхнічным уздыме рабочага класа, **ствараюцца прадпасылкі для знішчэння процілегласці паміж разумовай і фізічнай працай.** А гэта знішчэнне процілегласці паміж разумовай і фізічнай працай з'яўляецца адной з асноўных рыс комуністычнага грамадства.

Раней пытанне аб знішчэнні процілегласцей паміж разумовай і фізічнай працай ставілася ў галіне агульных мэт і задач. І ў **Маркса** і ў **Леніна** мы знаходзім тут толькі агульную пастаноўку пытання. Інакш і быць не магло, бо тады, з тых ступеней, яшчэ не былі ясны тыя рэчышчы, па якіх пойдзе ліквідацыя процілегласці паміж разумовай і фізічнай працай.

Таварыш Сталін паказаў канкрэтна тое рэчышча, той шлях, якім пойдзе знішчэнне процілегласці паміж разумовай і фізічнай працай. Гэтым шляхам з'яўляецца **культурна-тэхнічны ўздым рабочага класа, уздым яго да ўзроўню інжынерна-тэхнічных работнікаў.** І перадавікі рабочага класа, стаханаўцы, паказваюць у гэтых адносінах прыклад.

Перадавікі-стаханаўцы — гэта людзі, якія прайшлі ўсякага роду курсы і інш., аўладалі добра тэхнікай сваёй справы. Ёсць цэлы рад стаханаўцаў, якія ў сучасны момант выконваюць дыпломную работу па свайму варштату.

Яны ведаюць свой тэхналагічны працэс. Яны ведаюць свае прылады вытворчасці. Таварыш **Варашылаў** гаварыў пра пачынальнікаў стаханаўскага руху, што «гэта-ж прафесары ў сваёй справе». Гэта верна, бо стаханаўцы апракінулі ўсе нормы, усе ўказанні, усе разлікі, якія раней рабіліся ўсякага роду паважнымі акадэмікамі і прафесарамі.

Стаханаўцы — гэта не простыя рабочыя, якія стаяць ля свайго варштата і імкнуцца выкалаціць «доўгі рубель». Яны думаюць не толькі аб тым, каб больш зарабіць. Гэта людзі, якія аўладалі ведамі, аўладалі тэхнікай сваёй справы і якія ўжо ўзняліся на такі ўзровень, што яны могуць з'явіцца інструктарамі, арганізатарамі справы на вытворчасці. У стаханаўскім руху мы бачым тыя канкрэтныя шляхі, якімі пойдзе знішчэнне процілегласці паміж фізічнай і разумовай працай, бачым, як падрыхтоўваюцца ўмовы для пераходу ад социялізма да комунізма.

Стаханаўскі рух паказвае нам новых людзей з іх новымі, комуністычнымі адносінамі да працы. Але значэнне стаханаўскага руху заключаецца таксама ў тым, што ён павялічвае прадукцыйнасць працы, стварае больш высокую яго прадукцыйнасць у параўнанні з капіталізмам.

А комунізм-жа, як гэтаму вучаць **Маркс, Энгельс, Ленін, Сталін,** мыслімы толькі тады, калі ўсе крыніцы грамадскага багацця пальюцца поўным патокам.

Стаханаўскі рух выдатны іменна тым, што ён павялічвае прадукцыю нашай социялістычнай прамысловасці, наша багацце, рэсурсы социялістычнай дзяржавы.

Мы бачым, як у рэзультаце стаханаўскага руху, — а ён толькі ў пачатку — узрасла магутнасць нашых заводаў, павялічылася працаздольнасць транспарту. Не буду прыводзіць тут даных, бо ў дакладах тт. Молатава, Кагановіча, Орджанікідзе бліскуча паказана, як узрасла адразу вытворчая магутнасць шахт Данбаса, трактарных і паравозабудаўнічых заводаў і іншых заводаў машынабудаўніцтва, магутнасць нашай металургіі, узраслі магчымасці транспарту. Па раду прадпрыемстваў яна павялічваецца ўдвая.

Мы атрымалі паскарэнне ўсяго руху к комунізму. Не толькі асобныя прадпрыемствы, але і цэлыя галіны прамысловасці заяўляюць аб тым, што план другой пяцігодкі будзе выканан за чатыры гады.

Задача партыі заключаецца цяпер у тым, каб, следуючы ўказанням таварыша Сталіна, следуючы рашэнням пленума ЦК, уключыцца ў справу разгортвання стаханаўскага руху, перамагчы ўсе перашкоды, зламаць усякае супраціўленне стаханаўскаму руху, знамянуючаму канчатковую перамогу социялізма над капіталізмам.

Таварышы, цяпер пасля таго, як эксплаататарскія класы разгромлены і ліквідаваны, калі створана буйная машынная індустрыя, калі сялянства аб'ядналася ў калгасы, — няма і не можа быць ніякіх непераможных перашкод для нашага далейшага руху да комунізма.

Партыя разграміла трацкістаў і правых апартуністаў, якія змагаліся супроць ленінска-сталінскай тэорыі перамогі социялізма. Социялізм перамог у нашай краіне канчаткова і беспаваротна. Гэтага ўжо ніхто ад нас адабраць не можа.

Нельга, аднак, забываць, што мы жывем у капіталістычным акружэнні, што найбольш агалцелыя прадстаўнікі імперыялісцкай буржуазіі куюць змовы супроць нас, рыхтуюць новыя планы нападу на краіну Советаў, на краіну социялізма. Мы не можам ні на мінуту забываць, што партыя ВКП(б) — секцыя Ленінскага Комуністычнага Інтэрнацыянала і наша задача — дабіцца перамогі справы Леніна, справы комунізма ва ўсім свеце.

Социялістычная дзяржава

Іменна цяпер, калі нашы поспехі такія вялікія, калі мы пераступаем парог у социялістычнае грамадства, карысна напомніць, што Ленін і Сталін заўсёды папярэджваюць членаў партыі не паддавацца галавакружэнню ад поспехаў, не зазнавацца.

Трэба бачыць своеасаблівасць і асаблівасці цяперашняга этапа, пасрэдствуючыя звенні і ступені для далейшага руху.

Уся гаспадарка СССР стала социялістычнай. І ў горадзе і ў вёсцы яна вядзецца па адзінаму социялістычнаму плану.

Аднак, у нас захоўваецца грашовая сістэма, і нам неабходна ўмацоўваць совецкі рубель. Нам трэба развіваць і ўдасканальваць совецкі гандаль. Мы можам будаваць і развіваць вытворчасць толькі на базе цвёрдага гаспадарчага разрахунку. Перадавыя прадпрыемствы паказваюць прыклад таго, як трэба весці барацьбу за рэнтабельнасць, за зніжэнне сабекошту. Усе гэтыя пытанні пастаўлены былі ва ўвесь рост на апошняй сесіі вышэйшага органа пролетарскай улады — сесіі ЦВК.

І самае галоўнае — гэта строга захоўваць ленінска - сталінскі прынцып першай фазы комунізма «ад кожнага па здольнасцях, кожнаму па працы».

Таварыш Сталін следам за Леніным гаворыць нам, што «...пакуль канчаткова не знішчаны класы, і пакуль праца не стала са сродку для існавання першай патрэбнасцю жыцця, добраахвотнай працай на грамадства, людзі будуць аплачвацца за сваю работу па працы. «Ад кожнага па яго здольнасцях, кожнаму па яго працы», — такая марксісцкая формула социялізма, г. зн. формула першай стадыі комунізма, першай стадыі комуністычнага грамадства». (Сталін. Гутарка з нямецкім пісьменнікам Эмілем Людвігам. Ленін—Сталін, выбраныя творы ў адным томе, стар. 29. Партвыдат, 1935 г.).

Ленін лічыў захаванне гэтага прынцыпу адной з важнейшых норм социялістычнага грамадства, «...бо, не ўпадаючы ў утапізм, нельга думаць, што, скінуўшы капіталізм, людзі адразу навучаюцца працаваць на грамадства **без усякіх норм права,** дый эканамічных прадпасылак **такой** перамены адмена капіталізма **не дае адразу».** (Ленін, тв., т. XXI, стр. 435).

Прадукцыйнасць працы расце ў нашай краіне. Тэхнічная база, створаная пролетарскай дыктатурай, дазваляе з кожным годам павялічваць вытворчасць прадуктаў спажывання і павышаць матэрыяльны добрабыт працоўных.

Але да ажыццяўлення комуністычнага прынцыпу «ад кожнага па здольнасцях, кожнаму па патрэбнасцях» нам яшчэ далёка.

Трэба цвёрда ўсвоіць, неабходна настойліва ўкараняць у свядомасць мас, што дробнабуржуазная ўраўнілаўка, імкненне да роўнай дзяльбы прадуктаў, ураўнілаўка ў зарплаце з'яўляецца горшым ворагам социялізма, бо яна падрывае стымулы да працы, да павышэння кваліфікацыі, бо яна заахвочвае лодыраў і рвачоў, спрыяе захаванню горшых перажыткаў капіталізма, падрывае справу социялістычнага будаўніцтва.

«Маркс і Ленін гавораць, што розніца паміж працай кваліфікаванай і працай некваліфікаванай будзе існаваць нават пры социялізме, нават пасля знішчэння класаў, што толькі пры комунізме павінна знікнуць гэта розніца, што, з прычыны гэтага, «зарплата» нават пры социялізме павінна выдавацца па працы, а не па патрэбнасці. Але нашы ўраўнілаўцы з гаспадарнікаў і прафсаюзнікаў не згодны з гэтым і думаюць, што гэта розніца ўжо знікла пры нашым совецкім ладзе. Хто праў — Маркс і Ленін або ўраўнілаўцы? Трэба думаць, што правы тут Маркс і Ленін». (Сталін, Пытанні ленінізма, выд. 10, стар. 452).

Прадстаіць яшчэ ўпартая работа па выхаванню пагалоўна ва ўсіх працоўных комуністычных адносін да працы, па ператварэнню працы з абавязку ў добраахвотную свядомую справу, у пярвейшую жыццёвую патрэбнасць для дасягнення такой ступені, калі кожны будзе **добраахвотна** працаваць па здольнасцях.

Перадавікі-стаханаўцы — рабочыя, калгаснікі, інжынеры і вучоныя — з'яўляюцца ў гэтых адносінах узорам і прыкладам для ўсіх працоўных.

Наша задача заключаецца ў тым, каб **пераканаць усіх** следаваць гэтым прыкладам і ўзорам работы.

Аднак, побач з пераканаппем, у тых-жа мэтах выхавання павінна дзейнічаць і «права»: хто больш і лепш працуе той і больш атрымлівае з грамадскай вытворчасці.

Ажыццяўляць найстражэйшым чынам гэты прынцып, ахоўваць грамадскую ўласнасць і гэты социялістычны парадак размеркавання ёсць адзін з пярвейшых абавязкаў партыі і дзяржавы, бо толькі на гэтай аснове мы можам развіць социялістычную вытворчасць, узняць на новую вышыню прадукцыйныя сілы, выхаваць свядомыя адносіны да працы і падрыхтаваць пераход да наступнай ступені комуністычнага грамадства.

Здавалася-б, што гэта ўжо дастаткова ўвайшло ў свядомасць, з'яўляецца агульнапрызнаным.

Сутнасць аднак заключаецца ў тым, каб практычна, штодзенна, ва ўсёй гаспадарчай рабоце ажыццяўляць гэты прынцып у аб'ёме цэлых галін, і ў адносінах да цэлых катэгорый рабочых, і ў адносінах кожнага асобнага рабочага. Кіраўнікам партыі і ўрада вядома, з якімі труднасцямі прыходзіцца сустракацца хоць-бы пры складанні гаспадарчых планаў.

Нарада стаханаўцаў паказала, што ёсць яшчэ рад сур'ёзнейшых скажэнняў у гэтай галіне. Аб гэтым гаворыць і рашэнне пленума ЦК, якое дае напрамак у палітыцы заработнай платы па лініі ажыццяўлення гэтага прынцыпу.

«Да таго часу, пакуль наступіць «вышэйшая» фаза комунізма, социялісты патрабуюць **найстражэйшага** кантролю з боку грамадства і **з боку дзяржавы** над мерай працы і мерай спажывання...» (Ленін, тв., т. XXI, стар. 437). Так вучыць Ленін у сваёй кнізе «Дзяржава і Рэволюцыя».

Дзяржава пролетарскай дыктатуры, створаная Леніным, ажыццяўляе сваю вялікую пераўтваральную ролю па знішчэнню класаў, па перабудове ўсіх грамадскіх адносін.

У рэзультаце ўцвярджэння социялістычных вытворчых адносін у нашай краіне змяняецца і наша дзяржава. Яна стала дужай і моцнай, як ніколі. Не было і не можа быць ні пры якім іншым грамадскім ладзе такой моцнай, магутнай улады, якою з'яўляецца совецкая ўлада.

Мы гаворым цяпер з поўным правам — наш народ, урад народаў СССР, мы Чырвоную армію называем арміяй нашых народаў, мы чуем звароты да таварыша Сталіна, як да правадыра народу.

Так, упершыню ў гісторыі такія словы, як народ, радзіма, народны ўрад, сталі рэальнасцю, ператварыліся ў плоць, сталі поўнапраўнымі.

Ва ўмовах капіталізма, у вуснах буржуазных партый гэтыя лозунгі народу, нацыі, радзімы з'яўляюцца такім-жа здзекам, такой-жа фальшу, маной, як і праславутыя лозунгі свабоды, роўнасці братэрства. І калі фашызм прабуе яшчэ лавіць на гэту вудачку, адурманьваць народныя масы, то гэтыя спробы ўжо выкрыты і выкрываюцца ў народных масах усім ходам падзей, палітыкай фашысцкіх дыктатур, якія з'яўляюцца ў сапраўднасці злейшым, люцейшым і самым наглым ворагам не толькі чужых але і «сваіх» народаў.

Толькі перамога социялізма, ліквідацыя эксплаататарскіх класаў сапраўды аб'яднае ўвесь народ, аб'яднае ўсе нацыі. Ленін гаварыў: прыватная ўласнасць раз'яднае, социялізм аб'яднае. І мы бачым сапраўды цяпер, як грамадская ўласнасць, пераход усіх сродкаў вытворчасці ў рукі ўсіх працоўных, аб'яднала і з кожным крокам мацней аб'яднае народы Совецкага Саюза ў адну дружную, роўнапраўную сям'ю, у агульны саюз, у саюз сапраўды ўсенародных сіл, працуючых разам, узгоднена, адной воляй, адным імкненнем стварыць для ўсіх культурнае, заможнае жыццё, павялічыць магутнасць краіны, памножыць грамадскае багацце, ад чаго цяпер сапраўды залежыць добрабыт усіх.

І калі раней асновапаложнікі марксізма рэзка крытыкавалі лозунг народнай дзяржавы, як фальш і ліцамер'е, як ярлык, за якім хаваецца ў сапраўднасці класавы падзел, непрымірымыя супярэчнасці, падняволенне большасці народу, то мы цяпер можам з поўным правам сказаць: так, наша дзяржава народная дзяржава, так, яна ў поўным сэнсе ва ўсіх адносінах, не толькі па сваіх мэтах, але і па сваёй сутнасці, па сваіх парадках, нормах, з'яўляецца дзяржавай социялістычнай.

І тыя рашэнні аб змене Совецкай канстытуцыі, якія прыняты ў мінулым годзе VII з'ездам Советаў па ініцыятыве таварыша Сталіна, рашэнні аб далейшай дэмакратызацыі выбарчай сістэмы ў сэнсе змены не ўсім роўных выбараў роўнымі, многаступенных — прамымі, адкрытых — закрытымі, ідуць якраз па гэтай лініі. Наша пролетарская дзяржава становіцца дзяржаўнай формай социялістычнага грамадства.

Тут патрэбна, аднак, падкрэсліць, што толькі апартуністы могуць вытлумачыць гэта як зніжэнне ролі пролетарскага авангарда.

Не, перад веліччу новых задач пролетарскаму авангарду неабходна падняцца на новую ступень свядомасці, культуры, быць прыкладам у гэтых адносінах для ўсіх працоўных, каб дабіцца поўнага росквіту культуры, навукі, дабіцца социялістычнага багацця.

Ленін і Сталін падкрэсліваюць, што дзяржава неабходна і ў першай фазе социялізма. І гэта будзе яшчэ больш моцная і магутная дзяржава. Калі Сталін гаворыць аб тым, што шлях да адмірання дзяржавы ляжыць праз яе ўзмацненне, то гэта значыць, што побач з удасканаленнем, лепшай арганізацыяй работы дзяржаўных органаў, падборам і вылучэннем туды лепшых, таленавітых арганізатараў, кіраўнікоў, неабходна далейшае развіццё совецкай дэмакратыі, далейшае ўцягванне мас у кіраванне дзяржавай. Трэба дабіцца таго, каб тырыліся рады людзей, непартыйных большэвікоў, накшталт стаханаўцаў, камбайнераў, трактарыстаў, перадавых калгаснікаў, якіх прымалі ў сябе Сталін і ўрад і якія стаяць на ўзроўні дзяржаўных задач, з'яўляюцца дзяржаўнымі людзьмі, паказваюць прыклад добраахвотнага, свядомага выканання задач і норм социялістычнай дзяржавы.

Нам прадстаіць прайсці цэлую гістарычную поласу совецкай дэмакратыі, прывыкнуць да павагі і выканання совецкіх законаў, норм, правіл, навучыцца паважаць свае абавязкі, годнасць і гонар грамадзяніна социялістычнай краіны, прайсці доўгую школу выхавання добрасумленнасці ва ўсіх, каб падыйсці к бездзяржаўнаму грамадству, к поўнаму комунізму.

Перажыткі капіталізма ў свядомасці людзей, старыя прывычкі і навыкі яшчэ напамінаюць аб сабе з усіх бакоў. І прадстаіць яшчэ многа прапрацаваць, каб саскрэбці, змыць з сябе брудныя плямы старога грамадства.

Тут ніякіх ілюзій ствараць нельга. Было-б глыбокай памылкай сказаць, што пераход к комунізму пачнецца заўтра. Трэба ясна бачыць перспектыву, пасрэдствуючыя ступені, якія яшчэ неабходна прайсці і гістарычны размах работы.

Трэба цвёрда памятаць, што гэта далейшае развіццё, гэты пераход не ажыццёвіцца сам сабой, што труднасці і вялікія труднасці прадстаяць і на гэтым новым шляху, што размах гэтай работы перавышае чалавечае ўяўленне, і патрэбуецца далейшае ўдасканаленне арганізацыі і кіраўніцтва будаўніцтвам социялізма.

Таму неабходна барацьба з апартуністамі, з тымі, хто, па выражэнню таварыша Сталіна, прыходзіць «у цялячае захапленне ў чаканні таго, што хутка не будзе ніякіх класаў, — значыць не будзе класавай барацьбы, — значыць не будзе клопатаў і хваляванняў, — значыць можна скласці зброю і пайсці на бакавую — спаць у чаканні прыходу бяскласавага грамадства». (Сталін, Пытанні ленінізма, выд. 10-е, стар. 581).

Заключэнне

Таварышы, наша партыя дабілася гэтых перамог, перамогшы велізарныя труднасці, яна дабілася гэтых перамог у барацьбе з класавым ворагам, цвёрда следуючы заветам Леніна.

У сваёй прамове на выпуску акадэмікаў Чырвонай арміі таварыш Сталін гаварыў аб нашых ворагах: «Гэтыя людзі, відавочна, забылі, што мы, большэвікі — людзі асобага пакрою. Яны забылі, што большэвікоў не запалохаеш ні труднасцямі, ні пагрозамі. Яны забылі, што нас каваў вялікі Ленін, наш правадыр, наш настаўнік, наш бацька, які не ведаў і не прызнаваў страху ў барацьбе. Яны забылі, што чым мацней шаленствуюць ворагі і чым больш упадаюць у істэрыку праціўнікі ўнутры партыі, тым больш накаляюцца большэвікі для новай барацьбы і тым імклівей рухаюцца яны наперад». (Прамова таварыша Сталіна ў Крэмлеўскім палацы на выпуску акадэмікаў Чырвонай арміі 4 мая 1935 года, брашура Партвыдата, 1935 год, стар. 10—11).

І зараз, калі перад намі стаіць найвялікшая задача — яшчэ больш павышаць моц і боездольнасць партыі, як авангарда пролетарыята, як правадыра і арганізатара ўсіх працоўных у барацьбе за перамогу комунізма, — павышаецца роля і значэнне, палітычная адказнасць кожнага члена партыі.

Цэнтральны Камітэт партыі, следуючы завету Леніна — трымаць высока і захоўваць у чыстаце вялікае званне члена партыі, — правёў у гэтым годзе выключна вялікую работу па ўмацаванню радоў партыі, па вызваленню яе ад жулікаў, авантурыстаў, прымазаўшыхся, правёў вялікую работу па ўпарадкаванню партыйнай гаспадаркі.

Мерапрыемствы Цэнтральнага Камітэта па праверцы партыйных дакументаў і абмену партыйных білетаў і накіраваны к таму, каб вызваліць партыю ад тых, хто ганьбіць гэта высокае званне члена партыі, хто жульніцкім шляхам прымазаўся да вялікай партыі Леніна—Сталіна.

Рашэнні снежаньскага 1935 г. пленума ЦК ВКП(б) у сувязі з вынікамі праверкі партыйных дакументаў патрабуюць, каб правільнай арганізацыяй прыёму ў рады партыі новых членаў забяспечыць яе рады папаўнеллем лепшымі з лепшых — тымі героямі і перадавікамі ў горадзе і вёсцы, якія паказваюць узоры прадукцыйнасці працы, якія паказваюць сябе дзяржаўнымі людзьмі нашай социялістычнай дзяржавы, уцягваюць за сабою масы, з'яўляюцца піонерамі ў справе будаўніцтва новых пачаткаў социялістычнага жыцця. І разам з тым, таварышы, зараз трэба асабліва налегчы на ўзняцце партыйна-выхаваўчай работы ўнутры нашай партыі. Усе мы памятаем завет Леніна аб значэнні тэорыі, аб значэнні марксісцка - ленінскага выхавання, усе мы памятаем заклік таварыша Сталіна на XVII з'ездзе: «узняць тэарэтычны ўзровень партыі на належную вышыню». На аснове гэтых указанняў значна ўзмацнілася за апошні час ідэйна-палітычнае жыццё партыйных арганізацый. Але ёсць яшчэ буйнейшыя недахопы ў арганізацыі на мясцах гэтай важнейшай галіны работы. У нас не ўзнят яшчэ прапагандыст. Яму не надаецца яшчэ таго значэння, якое надаваў прапагандысту Ленін, якое надае яму Сталін. Таварыш Сталін патрабуе ад нас узняць прапагандыста, бо прапагандысту давяраецца адказнейшая справа выхавання мас, прапаганды марксісцка-ленінскай тэорыі, выкладання гісторыі нашай партыі, узбраення мас для далейшай барацьбы і будаўніцтва.

Да гэтага часу ў нас прапагандыст знаходзіцца ў партыйнай арганізацыі недзе на заднім плане, між тым, як прапагандысцкая работа мае зараз велізарнейшае значэнне.

Калі справа ідзе аб пастаноўцы палітычнай асветы, аб тым, каб чытаць, аб тым, каб займацца марксісцка-ленінскай тэорыяй, нашы актывісты, нашы сакратары райкомаў звычайна спасылаюцца на сваю занятасць. Але, таварышы, занятасць будзе заўсёды. Напэўна, у нас не будзе такога парадку, калі-б мы вызваліліся ад усіх і ўсялякіх спраў і ператварыліся ў бяздзельнікаў. Думаю, што гэтага не будзе і пры поўным комунізме. (**Смех**). Таму чакаць, калі мы вызвалімся ад спраў для таго, каб заняцца тэорыяй, — гэта, таварышы, не справа.

Сергей Міронавіч **Кіраў** у адной са сваіх апошніх прамоў гаварыў: «Калі мы закранаем пытанні самаадукацыі, у нас часцей за ўсё адзін аргумент — няма калі, цэлы дзень бегатня, цэлы дзень язык на плячы. А я раю, вось папрабуйце гэты язык з пляча знясць хоць-бы на гадзіну (**смех**), паглядзіце, і вы ўбачыце, што нічога страшнага не адбудзецца, лепш будзе. Думаюць, што калі ты запыхаўся, калі пот з цябе градам коціць — вось гэта работа.

Мы хочам так наладзіць нашу работу, каб кожны з нас знаходзіў час і для газеты, і для кнігі, для вывучэння ленінізма, і для павышэння свайго культурнага ўзроўню. Гэта будзе велізарным укладам у нашу практычную работу і ўзнагародзіцца старыцай. Толькі так і можна ўзняць на належную вышыню тэарэтычны ўзровень членаў партыі» (С. М. Кіраў. Артыкулы і прамовы 1934 г., стар. 169).

Я думаю, што гэта заўвага Сергея Міронавіча **Кірава** пападае зараз якраз у пункт. Нам трэба, таварышы, усур'ёз узяцца за тое, каб узброіць членаў партыі тэорыяй марксізма-ленінізма, пры дапамозе якой мы перамаглі і пры дапамозе якой мы даб'емся яшчэ больш бліскучых перамог у будучым.

Мы абавязаны следаваць прыкладу вялікага правадыра нашага таварыша Сталіна, які спалучае ў сабе клопаты аб штодзённых патрэбах практыкі социялістычнага будаўніцтва з аднаасновымі клопатамі аб нястомнай прапагандзе ленінізма ў радах партыі. Калі мы зараз можам гаварыць аб тым, што справа Леніна ў нашай краіне перамагла канчаткова і беспаваротна, то гэтым, таварышы, мы абавязаны таму, што на чале нашай партыі стаіць лепшы прадаўжальнік справы Леніна, яго спадзяўнік, яго саратнік — таварыш Сталін. (**Бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты, усе ўстаюць, наладжваючы таварышу Сталіну доўгую авацыю**).

Мы бачым, як з усіх канцоў совецкай зямлі, з усіх канцоў нашага неабдымнага Совецкага Саюза з'язджаюцца дэлегацыі, ідуць рапарты, паведамленні таварышу Сталіну ад радавых рабочых, ад калгаснікаў, у якіх расказваюць аб тым, чаго яны дабіліся на сваіх участках, на сваёй зямлі, на сваіх фабрыках, заводах для таго, каб забяспечыць перамогу ленінскай справы.

І гэта зразумела, бо ў свядомасці ўсіх членаў нашай партыі, у свядомасці рабочых і калгаснікаў Совецкага Саюза, у свядомасці рабочых за граніцай Сталін і Ленін гэта адно. (**Узрыў апладысментаў. З МЕСЦА: нашаму любімаму правадыру таварышу Сталіну жадаем стагоддзя плённай работы. Бурныя, доўгія апладысменты**).

Праў быў наш друг Анры Барбюс, які сказаў у сваёй кнізе аб Сталіне, кнізе, якою ён закончыў жыццёвы шлях: «Сталін — гэта Ленін сёння». (**Бурныя апладысменты**).

У гэты дзень мы шлем прывітанне ўсім нашым братам, хто змагаецца за перамогу справы Леніна, справы комунізма ва ўсім свеце. (**Уся зала стоячы доўга апладзіруе**).

СТАХАНАЎСКАЯ ДЭКАДА І ПЯЦІДНЕЎКІ НА прадпрыемствах БССР

ФАБРЫКА ІМЯ КАГАНОВІЧА

23 студзеня — ў трэці дзень стаханаўскай дэкады—фабрыка выпусціла 5.876 пар абутку, а 24 студзеня—6.271 пару пры плане выпуску ў дзень 5.700 пар.

Наперадзе ідзе першая група першага пашывачнага цэха. 23 студзеня гэта група дала за змену 1.716 пар, 24 студзеня — 1.740 пар, пры плане 1.250 пар.

Дрэнна падрыхтаваўся да дэкады цэх парусінавага абутку (начальнік цэха **Каган**), які пры плане штодзённага выпуску 800 пар абутку 23-га даў толькі 325 пар, а 24-га — 483 пары.

ЗАВОД «БОЛЬШЭВІК»

У другі дзень стаханаўскай дэкады — 21 студзеня—уся прадукцыя завода здана на «добра». Першы хромавы цэх (галоўны інжынер **Капілевіч**) у гэты дзень здаў прадукцыю па «выдатна». На «выдатна» здалі прадукцыю брыгада пабіўшчыкаў на рамы (старшы брыгадзір-комсамолец **Пекер**), і брыгада гляйтоўшчыкаў другога хромавага цэха (старшы брыгадзір **Гембіцкі**).

24 студзеня зданая прадукцыя завода ацэнена на «выдатна».

ЗАВОД ІМЯ МОЛАТАВА

Стаханаўская дэкада пачалася на заводзе 20 студзеня. У першы дзень план быў выканан на 104,7 проц., у другі дзень — на 118,5 проц. і трэці дзень — на 109 проц.

Першыя дні паказалі ўжо, што адміністрацыя не падрыхтавалася як след да стаханаўскай дэкады. У мэблевым цэху трэці калектыў не атрымаў своечасова бачкоў да скрынак сталоў. У рэзультаце значная частка прадукцыі ляжыць няскончанай і трэці калектыў дае нізкі процант выканання плана.

ЗАВОД ІМЯ ВАРАШЫЛАВА

23 студзеня пачалася стаханаўская пяціднеўка ў ліцейным цэху. За першы дзень план выканан на 168,5 проц., за другі — на 187,4 проц.

НА СЕСІІ СОВЕТА ЛІГІ НАЦЫЙ

АБМЕРКАВАННЕ РАЗРЫВУ УРУГВАЕМ АДНОСІН З СССР У ЖЭНЕВЕ

ЖЭНЕВА, 23 студзеня. (БЕЛТА). Пасля прамовы тав. **Літвінава** Совет Лігі нацый заслухаў тлумачэнні уругвайскага прадстаўніка Гуані. Пасля перапынку слова для рэплікі ўзяў тав. Літвінаў. Яго выступленне зрабіла вялікае ўражанне на прысутных.

У адказ зноў выступіў Гуані, потым з новай рэплікай — тав. Літвінаў.

Па прапанове старшыні Бруса, Совет назначыў дакладчыка і двух судакладчыкаў, якія павінны вывучыць пытанні, ці ёсць у даным выпадку парушэнне артыкула 12 статута Лігі і наколькі ўгрунтавана абвінавачанне Уругвая па адрасу СССР.

У якасці дакладчыка назначан дэлегат Румыніі Тытулеску, судакладчыкамі — прадстаўнікі Даніі і Іспаніі.

Даючы сваю згоду, дэлегат Румыніі Тытулеску атаварыў сваё права запытваць, у выпадку неабходнасці, думку аўтарытэтных юрыдычных экспертаў.

Не паспела закончыцца гэта частка абмеркавання совецкай скаргі, як па кулуарах Лігі пашырылася паўтораная, потым многаразова, чутка аб тым, што прадстаўнік Уругвая Гуані нібыта заявіў, што калі да заўтрашняга дня Тытулеску не прадставіць свайго даклада, Уругвай выйдзе з Лігі нацый.

Прамова т. Літвінава і яго рэплікі зрабілі тут велізарнае ўражанне як сваім ясным і непераможна пераканаўчым аналізам пытання, так і прыведзенымі фактамі палітычнай і дыпламатычнай гісторыі.

У якасці адной з асноўных асаблівасцей выступленняў Літвінава падкрэсліваецца, што ўсе яны былі строга вытрыманы ў духу паважання прынцыпаў Лігі, але таксама, не гледзячы на спакойна бязлітасную іронію ў адносінах «уругвайскіх дыпламатычных метадаў»— і ў духу павагі да нацыянальнага гонару малых нацый.

(Падрабязны змест рэплік тав. Літвінава будзе надрукаван ў заўтрашнім нумары)

БУЙНЫ ДЫПЛАМАТЫЧНЫ ПОСПЕХ СССР

РЭЗАЛЮЦЫІ СОВЕТА ЛІГІ НАЦЫЙ

ЖЭНЕВА, 24 студзеня. (БЕЛТА). Сёння адбылося заключнае пасяджэнне 90-й чарговай сесіі Совета Лігі нацый.

У ліку іншых пытанняў Совет аднагалосна зацвердзіў прапанаваны румынскім дэлегатам Тытулеску праект рэзалюцыі па поваду разрыву Уругваем дыпламатычных адносін з СССР. Рэзалюцыя гаворыць:

Совет канстатуе, што прадстаўнік Уругвая, спасылаючыся на тое, што пытанне гэта з'яўляецца прадметам унутранога заканадаўства, адмовіўся даць патрабуемыя совецкім урадам доказы, а прадстаўнік СССР заявіў, што ён задаволен адмаўленнем Уругвая прадставіць доказы абвінавачанняў, высунутых супроць совецкай місіі ў Монтэвідэо, што ён гатоў паставіць гэта пытанне на суд міжнароднай грамадскай думкі, на што згодзен таксама са свайго боку і прадстаўнік Уругвая.

З прычыны таго, што перад Сэветам гэта пытанне паставлена ў парадку параграфа 2 арт. 11 статута Лігі і паколькі яго місія заключаецца галоўным чынам у прымірэнні бакоў, — усякае рашэнне, якое ён можа прыняць, павінна быць прынята аднагалосна.

Совет выказвае надзею, што перарыў дыпламатычных адносін паміж Уругваем і СССР будзе насіць часовы характар і што абедзве краіны скарыстаюць спрыяючы выпадак для аднаўлення гэтых адносін. Совет запрашае абодва бакі ўстрымлівацца ад усякіх актаў, якія маглі-б пашкодзіць інтарэсам міру і аднаўленню іх дыпламатычных адносін у будучым».

У жэнеўскіх колах сёнешняе рашэнне Совета па поваду разрыву Уругваем дыпламатычных адносін з СССР расцэньваецца, як вельмі буйны міжнародны палітычны поспех СССР.

***

НЬЮ-ІОРК, 24 студзеня. (БЕЛТА). Друк ЗША публікуе на відным месцы падрабязныя паведамленні, якія ў адабраючых тонах прыводзяць змест прамоў тав. Літвінава на пасяджэнні Совета Лігі нацый па пытанню аб разрыве Уругваем дыпламатычных адносін з СССР. Карэспандэнт «Нью-Іорк таймс» адзначае, што уругвайскі прадстаўнік адказаў увертліва на патрабаванне Літвінава прадставіць доказы абвінавачанняў супроць Совецкага Саюза.

***

ЛОНДАН, 24 студзеня. (БЕЛТА). Англійскі друк шырока прыводзіць змест прамоў, сказаных учора тав. Літвінавым на сесіі Совета Лігі нацый па пытанню аб разрыве Уругваем дыпламатычных адносін з СССР. Ва многіх паведамленнях з Жэневы прамовы Літвінава характарызуюцца як бліскучыя і памайстэрску складзеныя.

VIII З'ЕЗД ФРАНЦУЗСКАЙ КОМПАРТЫІ

ПАРЫЖ, 23 студзеня. (БЕЛТА). На вячэрнім пасяджэнні VIII з'езда французскай комуністычнай партыі з вялікім дакладам выступіў генеральны сакратар компартыі **Тарэз**. Даклад быў прысвечан пытанню аб дзейнасці компартыі ў народным фронце, пытанню барацьбы за хлеб, мір і свабоду.

СОВЕТ ЛІГІ АБ ДАНЦЫГСКІМ ПЫТАННІ

ЖЭНЕВА, 24 студзеня. (БЕЛТА). Совет Лігі нацый зацвердзіў сёння даклад Ідэна, які канстатуе, што рад мер данцыгскага сената парушае канстытуцыю. Некаторыя распараджэнні сената, у прыватнасці дэкрэт, які зводзіцца к удушэнню апазіцыйнага друку, будуць перададзены данцыгскаму вярхоўнаму суду для перагляду. Сесія Совета Лігі закрылася.

НОВЫ ФРАНЦУЗСКІ УРАД

ПАРЫЖ, 24 студзеня. (БЕЛТА). Сфармаваны новы французскі ўрад. Габінет складаецца з 18 міністраў. Прэм'ер і міністр унутраных спраў — **Саро** (радыкал-соцыяліст), міністр замежных спраў — **Фландэн** (лідэр групы «Альянс дэмакратык»), ваенны міністр — генерал **Марэн** (беспартыйны), морскі міністр—**П'етры** (член парламенцкай групы «рэспубліканская левая», узначальваемай Фландэнам (займаў той-жа пост у габінеце Лаваля), міністр без партфеля — **Поль Банкур** (старшыня «социялістычнага саюза»).

Вайна ў Абісініі

УПАРТЫ КРОВЕПРАЛІТНЫ БОЙ НА ПАЎНОЧНЫМ ФРОНЦЕ

АДЫС-АБЕБА, 23 студзеня. (БЕЛТА). Толькі што атрымана афіцыяльнае паведамленне аб буйным баі на паўночным фронце ў раёне Ауса Аурадыя. Бой пачаўся 20 студзеня і прадаўжаецца да гэтага часу. Італьянцы панеслі страты, якія вылічаюцца тысячамі забітых. Абісінцы панеслі страты галоўным чынам ад кулямётнага агню. У баі прыняла ўдзел бамбардыровачная і штурмавая авіяцыя. Італьянцы адкінуты на поўнач, але прадаўжаюць весці ар'ергардныя баі.

***

ЛОНДАН, 23 студзеня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення, атрыманага з Адыс-Абебы, тысячы італьянцаў былі забіты ў буйным баі, які пачаўся на паўночным фронце 20 студзеня. Указваецца таксама, што абісінскія войскі захапілі ў італьянцаў многа гармат і снаражэння. Бой прадаўжаецца і прымае жорсткі характар. Ідуць рукапашныя баі, штыхавыя атакі і паветраная бамбардыроўка. Абісінцы сцвярджаюць, што яны адбілі некалькі атак італьянскіх войск і перайшлі ў контратаку, адцясніўшы італьянскія войскі.

Згодна вестак агенцтва Рэйтэр, Макале цалкам акружан абісінскімі войскамі, і італьянскі гарнізон атрымлівае снабжэнне паветраным шляхам.

Транспарт раненых абісінскіх салдат па дарозе ў шпіталь у Дэсі. (Саюзфото).

ВЯЛІКІЯ ПАВЕТРАНЫЯ МАНЕЎРЫ Ў ГЕРМАНІІ

ПРАГА, 23 студзеня. (БЕЛТА). Газета «Вечерні чэшске слово» паведамляе, што ў Саксоніі недалёка ад чэхаславацкай граніцы адбываліся вялікія манеўры германскага ваеннага паветранага флота. У манеўрах прымалі ўдзел паветраныя сілы гарнізонаў чатырох гарадоў. Манеўрамі кіраваў з Дрэздэна генерал паветранага флота Вахенфельд.

БЛІСКУЧЫ ПОСПЕХ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ

МАСКВА, 25 студзеня. (БЕЛТА). Старшыня Камітэта загатовак СНК СССР тав. **Клейнер** і начальнік Усесаюзнага аб'яднання «Заготлён» тав. **Радзика** рапартуюць ЦК ВКП(б) — тав. **Сталіну** і СНК СССР — тав. В. М. **Молатаву**, што ўстаноўлены ўрадам гадавы план загатовак ільну ўраджаю 1935 года па кантрактацыі ў пераводзе на валакно выканан поўнасцю 23 студзеня г. г. — раней мінулага года на 6 месяцаў.

Загатоўлена ільну на 16,1 проц. больш, чым у мінулым годзе і значна больш кожнага з папярэдніх год.

СВЯТКАВАННЕ СТАГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Н. А. ДОБРАЛЮБАВА

Для арганізацыі святкавання стагоддзя з дня нараджэння славутага крытыка і публіцыста Н. А. **Добралюбава**, якое спаўняецца 5 лютага 1936 года, ЦВК Саюза ССР стварыў юбілейны камітэт у складзе тт. **Бубнова** А. С. (старшыня), **Стаўскага** В. П. (саюз совецкіх пісьменнікаў), **Волгіна** В. П. (Акадэмія навук), **Савельева** М. А., **Воліна** Б. М., **Булганіна** Н. А., **Лебедзева-Палянскага** П. І. і пісьменнікаў: Алексея **Талстога**, Леаніда **Леонава**, Всевалада **Іванова**.

Дзяржаўнае літаратурнае выдавецтва выпускае поўны збор твораў Н. А. **Добралюбава** ў 6 томах пад агульнай рэдакцыяй П. І. **Лебедзева-Палянскага**.

Шаспітомнік твораў Добралюбава з'яўляецца першым поўным выданнем яго твораў за гады рэволюцыі і найбольш поўным у параўнанні з дарэволюцыйнымі выданнямі.

УСЕСАЮЗНАЯ СТАХАНАЎСКАЯ ДЭКАДА

Ініцыятыву магнітагорскага і іншых металургічных заводаў аб прадоўжанні стахаўскай пяцідзённкі да 1-га лютага (на 10 дзён) падтрымалі заводы «Усходсталі».

Кіраўнік «Усходсталі» тав. Седашоў і дырэктары кабакоўскага, тагільскага, чусаўскага, нижнесергінскага, ашынскага і першаўральскага заводаў паслалі тав. Орджанікідзе тэлеграму, у якой прапануюць правесці стахаўскую дэкаду. У тэлеграме расказваецца аб выключных поспехах, дасягнутых металургамі Урала за першыя 4 дні стахаўскай пяцідзённкі. Значна перавыкананы план выплаўкі чыгуну, сталі і выдачы прокату.

І САКАВІКА ЎСЕ ПАДПІСЧЫКІ НА ПАЗЫКУ ПАВІННЫ АТРЫМАЦЬ АБЛІГАЦЫІ

1 сакавіка — з зарплаты за другую палову лютага рабочыя і служачыя робяць апошні ўнос па калектыўнай падпісцы на «Пазыку другой пяцігодкі» (выпуска 3-га года). Да гэтага часу на ўсіх прадпрыемствах павінны быць закончаны разлікі з пазыкатрымальнікамі. Кожны падпісчык павінен атрымаць на рукі свае аблігацыі.

УКЛЮЧАЮЦЦА ВА ЎСЕБЕЛАРУСКУЮ СТАХАНАЎСКУЮ ПЯЦІДНЕЎКУ ПА ЛЕСУ

БАРЫСАЎ. **(Па тэлефону).** Барысаўскі леспрамгас уключыўся ва ўсебеларускую стахаўскую пяцідзённку па лесу. Райкомам партыі і райвыканкомам пасланы на лесаўчасткі і сельсоветы ўпаўнаважаныя для правядзення масавараслумачальнай работы сярод калгаснікаў — лесарубаў і возчыкаў.

***

ОРША. **(Па тэлефону).** Аршанскі леспрамгас уключаецца з 25 студзеня ва ўсебеларускую стахаўскую пяцідзённку па лесазагатоўках і вывазцы. Увесь апарат леспрамгаса выехаў у суседнія раёны, аб'яднаемыя леспрамгасам, для разгортвання масавай работы па арганізацыі стахаўскай пяцідзённкі.

Дырэктар леспрамгаса ЛІЎШЫЦ.

СОЎГАСЫ НЕ ПРЫСТУПІЛІ ДА ВЫВАЗУ ГАРУЧАГА

КАСЦЮКОВІЧЫ, 23 студзеня. (Кар. «Звязды»). Выбарка гаручага з касцюковіцкай нафтабазы машына-трактарнымі станцыямі і соўгасамі глыбінных раёнаў прахоладзіць яўна нездавальняюча. З 15 тон ліграіну, занараджанага для Хоцімскай і Клімавіцкай МТС, не ўзята ні аднаго кілограма. Чырвонапольская МТС яшчэ не забрала 7 тон газы. Не прыступілі да вывазу гаручага соўгасы імя Калініна (Чырвонапольскага раёна), «Батаева» і «Звязда» (Хоцімскага раёна).

В. ФЕСЬКО.

БССР КАЛЕКТЫВІЗАВАНА НА 85,6 ПРОЦАНТАЎ

За 1935 год у калгасы БССР уступіла 106.405 гаспадарак. За апошні квартал мінулага года ў калгасы ўлілося 11.229 гаспадарак працоўных аднаасобнікаў. У калгасы Лельчыцкага раёна ўступілі 404 аднаасобнікі, Старадарожскага раёна — 428, Мехаўскага — 812 гаспадарак. Зараз па БССР налічваецца 10.500 калгасаў. Колькасць калгасаў у параўнанні з трэцім кварталам у 4-м квартале зменшылася на 378 за кошт узбуйнення.

Усяго ў калгасах налічваецца 671.919 двароў. БССР калектывізавана на 85.6 проц. — у параўнанні з мінулым годам прырост на 13 проц. Самы высокі процант калектывізацыі мае Хойніцкі раён — 98.4 проц., Ветрынскі і Лёзнянскі раёны калектывізаваны на 96,4 проц., Уздзенскі — на 96,3 проц. (БЕЛТА)

ХЛЕБ НОВЫХ ГАТУНКАЎ

Гэтымі днямі ва ўсіх гарадах БССР выпускаюцца ў продаж новыя высокаякасныя гатункі жытняга хлеба 87-процантнага і 65-процантнага памолу. Кілограм хлеба з мукі 87-процантнага памолу будзе каштаваць 1 руб., а з мукі 65-процантнага памолу — 1 руб. 50 кап.

ПАМЯЦІ В. В. КУЙБЫШЭВА

24 студзеня рабочыя менскай фабрыкі імя Куйбышэва адзначалі гадавіну з дня смерці выдатнага арганізатара, крышталёва чыстага большэвіка В. В. Куйбышэва. На жалобны сход прышло больш 500 рабочых фабрыкі. Менскі аддзел радыёвяшчання арганізаваў літаратурна-мастацкую перадачу, прысвечаную жыццю і дзейнасці Куйбышэва. Ля мікрафона выступалі лепшыя стахаўцы фабрыкі. «Рабочыя павінны ганарыцца, што іх прадпрыемства носіць імя выдатнага большэвіка, павінны жыць і змагацца так, як тав. Куйбышэў», — так сказалі выступаўшыя стахаўцы Грунтаўнік і Башкова. (БЕЛТА).

УСЕБЕЛАРУСКАЯ РАДЫЁПЕРАКЛІЧКА ПА СПРАВАЗДАЧНАЙ КАМПАНІІ СОВЕТАЎ

24 студзеня была праведзена ўсебеларуская радыёперакліччка па пытанню справаздачнай кампаніі советаў. Перакліччку праводзіў сакратар ЦВК БССР тав. **Ляўкоў**. Прысутнічалі таксама загадчык совецка-гандлёвым аддзелам ЦК КП(б)Б тав. Бурачэўскі, загадчык орграддзела ЦВК тав. Град, сакратар Менскага горсовета тав. Казлоўскі, прадстаўнікі друку і інш. У радках да мікрафонаў былі выкліканы старшыні, сакратары і загадчыкі аддзелаў райвыканкомаў і горсоветаў і рад старшынь сельскіх советаў. Перакліччку, якая праводзілася па правадах двухбаковай сувязі, слухалі ўсе раёны рэспублікі.

З інфармацыяй аб падрыхтоўцы і ходзе справаздачнай кампаніі выступілі старшыня парыцкага РВК тав. Палей, сакратар крупскага РВК т. Гавольскі, старшыня мсціслаўскага РВК тав. Рай, сакратар чырвонапольскага РВК тав. Дзерушчанка і інш.

Асабліва дрэнна ідзе падрыхтоўка і сама справаздачная кампанія ў Крупскім і Мсціслаўскім раёнах, слаба разгорнута работа ў Шклоўскім і Дрыбінскім раёнах. Толькі ў Чырвонапольскім раёне справаздачная кампанія разгарнулася здавальняюча.

Тав. Ляўкоў звярнуў увагу ўсіх райвыканкомаў, горсоветаў і сельсоветаў на неабходнасць неадкладнага ўзмацнення работы па правядзенню справаздачнай кампаніі советаў і дэпутатаў перад выбаршчыкамі. Ён заклікаў вышэй узняць класавую пільнасць, шырока разгарнуць масава-палітычную работу вакол справаздачнай кампаніі.

11 ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК ГЛЯДЗЕЛА КІНОКАРЦІНУ «ЛЕНІН»

На працягу 4 дзён у менскім гукавым кінотэатры «Чырвоная зорка» дэманстравалася карціна «Ленін». З выключнай цікавасцю глядзелі працоўныя сталіцы гэты кінофільм. За гэтыя дні кінотэатр паведала 11 тыс. чалавек. Арганізоўваліся калектыўныя паходы ў кіно рабочых заводаў імя Кірава, імя Варашылава, студэнтаў, калгаснікаў аўцелей імя Куйбышэва і імя Кірава (БЕЛТА).

У гэтым годзе ў Беларусі небывала цёплы студзень. НА ЗДЫМКУ — незамёрзшая рака Свіслач.
Здымак зроблен 23 студзеня 1936 г. Фото Каплінскага.

ІНСТРУКТАРЫ ФІЗКУЛЬТУРЫ ДЛЯ КАЛГАСАЎ І СОЎГАСАЎ

Вышэйшы совет фізкультуры БССР намеціў у 1936 годзе падрыхтаваць 600 інструктароў фізкультуры для калгасаў і соўгасаў БССР. 100 інструктароў выпусцяць 6-месячныя курсы і 500 інструктароў—3-месячныя курсы, 50 фізкультурнікаў калгасаў і соўгасаў павысяць сваю спартыўную тэхніку ў рэспубліканскай спартыўнай школе. У акругах БССР адкрыюцца спартыўныя школы па асобных відах спорту. Заняткі па 6-месячных курсах інструктароў пачнуцца 1 лютага.

ЗДАРЭННЕ

★ **Аферысты.** Гр. Басько са сваім таварышчом варочаліся 20 студзеня з рынка. Па Ульянаўскай вуліцы іх абагнаў гр. Матусевіч І. О., які выпусціў з рук скрутак. Басько падняў яго. У гэты час невядомы, які ішоў ззаду, зацікавіўся знаходкай і прапанаваў Басько і яго таварышу зайсці ў двор і паглядзець, што знаходзіцца ў скрутку. Але падышоў Матусевіч, і невядомы зараз-жа схаваў скрутак. Матусевіч заявіў, што яны падняслі згубленыя ім грошы і патрабаваў ад Басько, каб той вярнуў яму іх. Басько заявіў, што ў яго свае грошы, паказаў уласны скрутак і паказаў яго Матусевічу. Агледзеўшы пакет, Матусевіч вярнуў яго назад Басько. Калі аферысты схаваліся, Басько разгарнуў вернуты яму скрутак і ўбачыў, што ў ім знаходзіцца нарэзаная папера і толькі зверху ляжала адна 5-рублёвая купюра. У скрутку Басько было 850 руб. Аферысты падманілі скрутку. Басько затрымаў Матусевіча і даставіў яго ў 3-е аддзяленне міліцыі. Вядзецца расследванне.

ПАВЕДАМЛЕННІ

26 студзеня 1936 года, у памяшканні клуба Працасветы (Комуністычная, 17), а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца нарада сакратароў парткомаў, парторгаў і старшынь заўкомаў, мясцкомаў.

Оргбюро Варашылаўскага гаррайкома КП(б)Б.

26 студзеня, а 6-й гадзіне ўвечары, у клубе імя Сталіна (рог Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай, у малой зале) Оргбюро Кагановіцкага райкома КП(б)Б склікае агульнараённую нараду прапагандыстаў і старост школ і гурткоў партыйнай і комсамольскай сеткі з абвесткай дня: ітогі пленуму ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б і задачы партыйнай прапаганды (дакл. т. Конік).

За поўную яўку адказваюць сакратары парткомаў і парторгі.

Оргбюро Кагановіцкага РК КП(б)Б.

27-га студзеня 1936 г., а 7-й гадзіне ўвечары, у Доме партактыва, пакой № 22 адбудзецца сход комуністаў-адзіночак Сталінскага раёна.

Оргбюро РК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Першы Беларускі дзяржаўны тэатр БДТ-1 | Сёння, 26 студзеня, КАНЕЦ ДРУЖБЫ. Пачатак у 8 г. веч. Білеты прадаюцца ў касе тэатра.

Гукавы кінотэатр «ПРОЛЕТАРЫЙ» | Амерыканскі гукавы фільм Чалавек-невідзімка

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» | Гукавы мастацкі фільм КАНВЕЕР СМЕРЦІ

Гукавы кінотэатр „Чырвоная зорка" | Гукавы мастацкі фільм ПАДРУГІ

Кіно «СПАРТАК» | Выдатны мастацкі фільм ПАРТЫЗАНСКАЯ ДАЧКА

Менскі гарадскі аддзел народнай асветы абвяшчае прыём слухачоў на аднагадовыя КУРСЫ па падрыхтоўцы выкладчыкаў мовы і літаратуры для няпоўнай сярэдняй школы.

Прымаюцца асобы з сярэдняй асветай. Стыпендыя ад 90 руб. і вышэй, у залежнасці ад паспяховасці. Кватэрай слухачы не забяспечваюцца.

Заявы прымаюцца **да 27 студзеня** г. г. у канцэлярыі 25-й базавай школы імя Чарвякова (Совецкая, 44), штодзённа ад 1 да 3 гадзін дня.

Да заявы неабходна прыкласці дакументы аб асвеце і соцстановішчы.

МЕНГАРАНА.

У сувязі з пераходам на сістэму ІНКАСО з 1 лютага г. г., горкіраўніцтва ўсебелканторы Дзяржбанка склікае нараду з кліентурай

НА 26 СТУДЗЕНЯ, у 8 гадзін веч., у памяшканні Дзяржбанка (другі паверх).

На нараду запрашаюцца кіраўнікі і галоўныя бухгалтары ўсіх арганізацый, праводзячых адгрузку тавараў.

Арганізацыі, якія ў свой час не зарэгістраваліся, павінны зарэгістравацца ў інкасавым аддзеле ў т. Грынблата (1 паверх) не пазней 28 студзеня.

ДЗЯРЖБАНК.

На падставе загаду ОРС'а Галоўдартранса НКУС БССР, АРЗ 1-га маршрута і Жодзінскага ўчастка

ЛІКВІДУЕЦЦА.

Установы і асобы, маючыя прэтэнзіі да АРЗУ, павінны іх прад'явіць да 1 лютага 1936 г. Пасля ўказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.

ЛІКВІДКОМ.

ГРАМАДСКІ УНІВЕРСІТЭТ БелНІТО СОЦЗЕМЛЯРОБСТВА
Комсамольская, 25, Дом тэхнікі, тэл. № 25-649
Сёння, у 7 гадзін вечара адбудзецца
ЛЕКЦЫЯ-ДАКЛАД прафесара т. ВЕЙСА
на тэму: „Спосабы павышэння прадукцыйнасці сельскагаспадарчых машын".
Уваход слухачоў па спісах. Запіс працягваецца.
БелНІТО СОЦЗЕМЛЯРОБСТВА.

БЕЛДЗЯРЖКАНСЕРВАТОРЫЯ абвяшчае НАБОР на курсы для дарослых без адрыву ад вытворчасці па спецыяльнасцях: 1) фортэпіяна, 2) спевы, 3) скрыпка, 4) віяланчэль, 5) па духавых аркестрах і народных інструментах, 6) баян, 7) кіраўнікоў самадзейных харавых гурткоў.

Заявы падаваць у канцэлярыю кансерваторыі з 10 г. раніцы да 4 гадзін дня.

Прыём заяў да 1 лютага 1936 г.

Адначасова арганізуецца ХОР.

Жадаючыя (рабочыя, служачыя і іх сем'і) падаюць заявы ў канцэлярыю кансерваторыі.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Цэнтральнае праўленне профсаюза вышэйшай школы і навукова-даследчых устаноў і цэнтральнае бюро секцыі навуковых работнікаў выказваюць глыбокае спачуванне народным і калектыву БелАН з прычыны смерці акадэміка

ГРЭДЫНГЕРА.

Дырэкцыя, партком і МК Клінічнага гарадка з жалем паведамляюць аб заўчаснай смерці ўрача скурна-венерычнай клінікі

ШУЛЬМАН РЭВЕКІ АБРАМАЎНЫ,

наступіўшай 24 студзеня 1936 года, і выказваюць сваё спачуванне яе сям'і.

Калект работнікаў Беларускага дзяржаўнага скурна-венералагічнага інстытута, клінікі скурных і венерычных хвароб БДМІ і скурна-венералагічнага дыспансера з вялікім жалем паведамляюць аб заўчаснай смерці асістэнта інстытута, загадчыка клінічнай лабараторыі

ДОКТАРА РЭВЕКІ АБРАМАЎНЫ ШУЛЬМАН,

наступаўшай 24 студзеня 1936 г. пасля цяжкай хваробы.

ПАТРЭБНЫ прыбіральшчыцы.
Звяртацца: Совецкая, 63, выдавецтва. „ЗВЯЗДА"

Патрабуюцца тэрмінова шоферы для выезду ў раёны БССР з гукавымі аўта-кінаперасоўкамі.
Звяртацца па адрасу: г. Менск, Белгоскіно, Совецкая, 90.

Справачная табліца

48 тыража выйгрышаў пазыкі „3-га рашаючага года пяцігодкі"

(Бяспроцантна-бяспройгрышны выпуск)

Тыраж праводзіўся ў г. Ленінакане ССР Арменіі 10 і 11 студзеня 1936 года.

Выйгрышы выпалі на наступныя №№ серый і аблігацый:

№№ серый	№№ аблігацый	Памер выйгрыша ў рублях	№№ серый	№№ аблігацый	Памер выйгрыша ў рублях
0029	80*)	200	5804	44*)	200
0095	53*)	200	5848	51*)	200
0143	55*)	200	5927	40*	200
0310	17*)	200	5969	81*)	200
0403	35*)	200	6021	1—100	50
0547	48*)	500	6039	11*)	200
0571	34*)	200	6257	37*)	500
0890	92*)	200	6685	65*)	200
0898	1—100	50	6734	03*)	200
0922	100*)	200	6889	97*)	200
1044	36*)	200	7033	09*)	200
1309	41*)	500	7084	76*)	200
1389	62*)	200	7209	57*)	500
1441	72*)	500	7335	73*)	500
1568	81*)	200	7374	02*)	500
1624	06*)	200	7471	1—100	100
1744	39*)	200	7507	98*)	200
2265	1—100	50	7533	67*)	200
2497	27*)	200	7545	87*)	200
2776	65*)	200	7801	81*)	200
2920	48*)	200	7866	15*)	200
3219	85*)	500	8089	32*)	500
3327	86*)	500	8357	79*)	200
3534	63*)	500	8389	07*)	500
3753	47*)	500	8410	34*)	200
3933	41*)	200	8530	23*)	500
4248	28*)	200	8640	1—100	[illegible]
4313	43*)	200	8756	51*)	[illegible]
4337	52*)	200	8917	70*)	500
4436	12*)	200	8968	1—100	50
4595	1—100	50	8979	49*)	500
4934	92*)	200	9039	03*)	500
4961	95*)	200	9197	81*)	500
5007	46*)	200	9532	90*)	200
5098	16*)	500	9574	66*)	500
5131	90*)	200	9602	1—100	50
5230	72*)	200	9748	14*)	500
5430	67*)	200	9763	13*)	200
5492	85*)	200	9808	81*)	200

*) Усе астатнія 99 аблігацый гэтай серыі выйгралі па 20 рублёў.

Уп. Галоўлітбела № К—20. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Тыраж 106.045.